


ФІЛАТЭЛІСТЫЧНАЯ НАВУКА 9

ДЗЯЎЧЫНА НА МАТАЦЫКЛЕ ВАКОЛ СВЕТУ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ЖНІЎНЯ 2018 г. СЕРАДА № 145 (28761)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Зараз ва ўрадзе і Нацбанку ідзе актыўная работа над прагнозам развіцця эканомікі і грашова-крэдытнай сферы ў 2019 годзе. Асноўнай мэтай грашова-крэдытнай палітыкі ў наступным годзе стане абмежаванне інфляцыі, якая вымяраецца індэксам спажывецкіх цэн, у межах 5 % (снежань 2019 года да снежня 2018-га). Нацыянальны банк працягне выкарыстоўваць рэжым манетарнага таргетавання. У прагназуемых макраэканамічных умовах ацэньваецца, што стаўка рэфінансавання можа быць зніжана да канца 2019 года да 9—9,5 % гадавых. Важнай задачай застаецца нарошчванне золатавалютных рэзерваў краіны да ўзроўню не менш як $7,1 млрд (два месяцы імпарту тавараў і паслуг)».*

# ВЫТВОРЧАЯ ПРАКТЫКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Студэнт пятага курса Беларускага аграрнага ўніверсітэта Уладзіслаў МАЛЧАНОВІЧ летнія канікулы праводзіць на жніве. Другі год запар КСУП «Стуга» Столінскага раёна давярае маладому спецыялісту працаваць на нарыхтоўцы хлеба. На айчынным камбайне «Палессе» будучы інжынер сельскай гаспадаркі ў спрыяльнае надвор'е за дзень намалочвае не меней за шэсць бункераў спелага збожжа.**

**— На гэтым камбайне раней працавалі мае родныя дзядзькі-механізатары, яны па-гаспадарску абыходзіліся з тэхнікай, таму мне яна дасталася дагледжаная, спраўная, — гаворыць Уладзіслаў Малчановіч. — А маю цікавасць да аўтатрактарнай тэхнікі прывіў і падтрымаў мой бацька, які таксама працуе ў гаспадарцы.**

**Гэты здымак быў зроблены за вёскай Альманы, што ва ўрочышчы Гачы, на полі трыцікале. У гэтыя дні КСУП «Стуга» завяршае абмалот збожжавага кліна.**

## КОРАТКА

• **Месячны пасажырапаток Нацыянальнага аэрапорта Мінск у ліпені 2018 года перасягнуў лічбу ў паўмільёна пасажыраў.**




• Штраф за распаўсюджванне забароненай інфармацыі на інтэрнэт-рэсурсах для юрыдычных асоб у Беларусі складзе да 100 БВ.

• **Мабільныя пункты для нарыхтоўкі крыві плануецца адкрыць ва ўсіх абласцях Беларусі.**

• У Беларусі ўводзіцца забарона на імітацыю чужога фірмавага стылю.

• **За песні II Еўрапейскіх гульняў можна прагаласаваць на сайце Белтэлерадыёкампаніі.**

# ТЭРЫТОРЫЯ БЯСПЕКІ

### Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў сакрэтным крызісным пакоі



**Інакш кажучы, гэта той астравок у бурлівым жыццёвым моры, дзе можна адчуваць сябе ў поўнай бяспецы. І скарыстацца ім можа любы, хто трапіў у бяду. Магчыма, не кожны яшчэ ведае, што такі пакой існуе. Але, калі ён камусьці спатрэбіцца, знайсці яго будзе не цяжка. Спецыялісты Магілёўскага раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва расказалі, як гэта зрабіць і хто часцей за ўсё карыстаецца гэтай паслугай.**

### Як падаць сігнал SOS

— Мы працуем у адпаведнасці з пратаколам міжведамаснага ўзаемадзеяння мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і іх структурных падраздзяленняў, зацверджаным Магілёўскім аблвыканкамам, — тлумачыць **загадчыца аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі цэнтра Іна ІВАШЫНА.** — Аналагічны распрацаваны на ўзроўні нашага райвыканкама. У сваёй рабоце мы актыўна супрацоўнічаем з раённым аддзелам адукацыі, паліклінікай № 11, раённым аддзелам унутраных спраў, SOS-дзіцячай вёскай, Магілёўскім жаночым цэнтрам падтрымкі і самаадукацыі, царквой. Распрацавана схема работы з сем'ямі, дзе адзначаліся факты гвалту. Калі ў РАУС ці іншую з пералічаных установ паступае трывожны сігнал і факт гвалту пацвярджаецца, мы бяром пацярпелага пад сваю апеку: аказваем яму неабходныя прававыя, псіхалагічныя і сацыяльныя паслугі. Ён таксама можа скарыстацца часовым прытулкам.

СТАР. 5

■ На дарозе

# ПАРКОЎКА ПА ПРАВІЛАХ

### У краіне апрабавалі новую сістэму «Паркрайт»

**З сакавіка ў Беларусі функцыянуе аўтаматычная фотафіксацыя парушэнняў спынення і стаянкі транспартных сродкаў «Паркрайт». Для гэтага было закуплена адпаведнае абсталяванне — усяго 15 прыбораў: на кожную з абласцей краіны і раёнаў горада Мінска. Фотафіксацыя адбываецца ў аўтаматычным рэжыме, дзякуючы чаму верагоднасць памылкі зведзена да мінімуму.**

Як расказаў **намеснік начальніка арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС Вадзім ПЕТЫШ,** прынцып дзеяння прыбора наступны. У населеным пункце вызначаецца некалькі зон, дзе сістэматычна парушаюцца правілы паркоўкі і стаянкі транспартных сродкаў. Іх геалакацыя заносіцца ў сістэму. На цяперашні момант па краіне вызначаны 82 зоны кантролю з дапамогай «Паркрайта», 44 з іх знаходзяцца ў Мінску. Сам прыбор размяшчаецца ў патрульнай аўтамашыне ДАІ і без удзелу інспектара, які сочыць за іншымі правапарушэннямі, аўтаматычна фіксуе ўсе аўтамабілі, прыпаркаваныя не па правілах дарожнага руху ў вызначанай зоне. Каб пазбегнуць недакладнасцяў, праз некаторы час экіпаж ДАІ яшчэ раз праязджае па абранай тэрыторыі. Прыбор звярае аўтамабілі, зафіксаваныя першы і другі раз, і ў якасці парушальнікаў вызначае кіроўцаў толькі тых транпартных сродкаў, якія трапілі на фотаздымак двойчы.

Пасля гэтага ўладальніку аўтамабіля накіроўваецца апавяшчэнне аб правапарушэнні. Штраф складзе адну базавую велічыню, для кіроўцаў грузавога аўтамабіля, аўтобуса, колавага трактара, самаходнай машыны, прычэпа — тры базавыя велічыні.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

# У цэнтры ўвагі — цэнтральны рэгіён

**Развіццё Мінскай вобласці і ход уборачнай кампаніі абмеркаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з кіраўніком рэгіёна Анатолем Ісачанкам. Тэмамі для размовы ў тым ліку сталі іншыя сектары АПК і дарожнае будаўніцтва.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Мінская вобласць — рэгіён паказальны: «Ён знаходзіцца ў розных кліматычных умовах. Поўдзень ужо, напэўна, палову ўбраў. Поўнач, можа, яшчэ толькі прыступіла да ўборкі. Там працэнтаў 15—20. Таму розныя кліматычныя ўмовы даюць сярэднія ўраджаі на краіне наогул». Звяртаючыся да старшыні Мінскага аблвыканкама, Прэзідэнт спытаў: «Што мы будзем мець? Зразумела, што збожжа не будзе такое ўраджайнае, як у мінулым, асабліва на поўдні. Дарэчы, на ўсходзе і поўначы і, напэўна, таксама ў Мінскай вобласці якраз сітуацыя іншая».

Прэзідэнт адзначыў, што ў Віцебскай вобласці і ўсходніх рэгіёнах вельмі добрыя ўраджайныя палі. На думку Аляксандра Лукашэнкі, «нам трэба спадзявацца ў гэтым годзе — усё ж такі кукурузны год — на тое, што мы мільён тон кукурузы, а можа быць і больш — хацелася б больш, — збяром і тым самым запоўнім недабор па збожжы».

Таксама кіраўнік дзяржавы прапанаваў разгледзець іншыя пытанні, у тым ліку развіццё мяса-малочнага напрамку і дарожнае будаўніцтва.

Пасля сустрэчы з кіраўніком дзяржавы Анатоль Ісачанка пракаментаваў журналістам, што быў дадзены шэраг даручэнняў па сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна. У прыватнасці, развіццю Барысаўскага і Маладзечанскага раёнаў павінна ўдзяляцца такая ж увага, як зараз Оршы. Закранулі таксама пытанні пасажырскіх перавозак, губернатар адзначыў, што неабходна рабіць камфортна для людзей, каб было зручна і танна.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Грошы

# ШТО БУДЗЕ З КУРСАМ І СТАЎКАЙ РЭФІНАНСАВАННЯ?

## У Нацбанку зрабілі справаздачу аб выніках рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі

**Рэальны курс беларускага рубля наблізіўся да раўнаважных значэнняў у другім квартале. Такая інфармацыя змяшчаецца ў дакладзе намесніка старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргея КАЛЕЧЫЦА для пашыранага пасяджэння праўлення, дзе падводзіліся вынікі рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі за першае паўгоддзе. Акрамя таго, у дакладзе адзначана, што ў перспектыве стаўка рэфінансавання можа быць зніжана да канца 2019 года да 9-9,5 % гадавых.**

### Застанецца ў раўнавазе

У дакладзе адзначана, што набліжэнне рэальнага курса рубля да сваіх раўнаважных значэнняў становуча ўплывае на інфляцыйныя працэсы. Гэта знізіла ціск з боку коштаў на імпартаваныя тавары. З іншага боку, такая дынаміка намінальнага абменнага курса будзе спрыяць павышэнню знешняй устойлівасці эканомікі.

Чакаецца, што ў другой палове 2018 года рэальны курс беларускага рубля працягне знаходзіцца блізка ад свайго раўнаважнага ўзроўню. Улічваючы перавагі плаваючага абменнага курса, Нацыянальны банк мае намер захаваць існуючыя падыходы да рэалізацыі курсавой палітыкі.

### Даларызацыя прыносіць краіне страты ў 2-3 % ВУП

У дакладзе таксама сказана, што агульныя разліковыя памер страт краіны ад даларызацыі ў суме можна ацаніць прыкладна ў 2-3 % ВУП штогод. Страты краіны ад гэтага працэсу сканцэнтраваны перш за ўсё ў галіне курсавых і інфляцыйных рызык.

З улікам сум запазычанасці па валютных крэдытах беларускія прадпрыемствы і бюджэт могуць несці значныя фінансавыя страты. Пры зніжэнні курса беларускага рубля да долара на 1 % страты прадпрыемстваў ад пераацэнкі валютнай крэдытнай запазычанасці беларускім банкам складуць BYN230 млн, страты бюджэту ад пераацэнкі знешняга доўгу — BYN330 млн. Даларызацыя ўплывае і на тэмп інфляцыі, паколькі замежная валюта ўдзельнічае ў працэсе абароту.

### Стаўка рэфінансавання ў 9 % да 2019 года?

У прагназаваных макраэканамічных умовах ацэньваецца, што стаўка рэфінансавання можа быць зніжана да канца 2019 года да 9-9,5 % гадавых. Зараз ва ўрадзе і Нацбанку ідзе актыўная работа над прагнозам развіцця эканомікі і грашова-крэдытнай сферы ў 2019 годзе.

Асноўнай мэтай грашова-крэдытнай палітыкі ў наступным годзе стане абмежаванне інфляцыі, вымеранай індэксам спажывецкіх цэн, у межах 5 % (снежань 2019 года да снежня 2018-га). Нацыянальны банк працягне выкарыстоўваць існуючую манетарную палітыку. Важнай задачай застаецца нарошчванне золатавалютных рэзерваў краіны да ўзроўню не меншага за 7,1 млрд долараў.

### Крэдытны бум яшчэ не спаў

Паводле статыстыкі, якую напярэдадні апублікаваў Нацбанк, па стане на 1 ліпеня запазычанасць фізічных асоб перад банкамі краіны па пазыковых сродках склала 10 мільярдаў 162,5 мільёна рублёў. Для параўнання: год таму гэты паказчык быў на ўзроўні 7 мільярдаў 694,5 мільёна. За чэрвень сума набраных крэдытаў павялічылася на 172,5 мільёна рублёў.

Пры гэтым тэрміновыя рублёвыя ўклады насельніцтва ў першым паўгоддзі выраслі на 12,3 %. Паводле інфармацыі, якая змяшчаецца ў дакладзе Сяргея Калечыца, да канца гэтага года Нацыянальны банк будзе імкнуцца захаваць нейтральнасць манетарных умоў, гэта абазначае мінімізацыю магчымых рызык.

Доля безадзыўных укладаў у агульным аб'ёме ўкладаў насельніцтва ў нацыянальнай валюце павялічылася з 52,4 % у снежні 2017 года да 68,8 % у чэрвені 2018 года. Доля доўгатэрміновых укладаў у агульным аб'ёме безадзыўных укладаў насельніцтва вырасла нязначна: з 67,8 % у снежні 2017 года да 67,9 % у чэрвені сёлета.




❍ У ТЭМУ

### КРЭДЫТАВАННЕ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

**Банкі краіны не змогуць у аднабаковым парадку павялічваць працэнты па крэдытах. Пра гэта сказана ў законе «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Банкаўскі кодэкс», які афіцыйна апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

У законе замацоўваюцца два падыходы да вызначэння памеру платы за карыстанне крэдытам: у абсалютным лічбавым выражэнні (фіксаваная гадавая працэнтная стаўка) і зыходзячы з разліковай велічыні, прывязанай да базавага паказчыка (зменная гадавая працэнтная стаўка).

Пры гэтым крэдытадавальнік не мае права ў аднабаковым парадку павялічыць памер працэнтаў за карыстанне крэдытам. Умовы крэдытнага дагавора, якія дазваляюць гэта зрабіць, лічацца нікчэмнымі, паколькі абмяжоўваюць правы крэдытаатрымальнікаў.

Акрамя таго, у жыхароў краіны з'явілася магчымасць датэрмінова поўнасцю або часткова пагашаць спажывецкія крэдыты з выплатай працэнтаў за тэрмін карыстання крэдытам без апавяшчэння банка. Пры гэтым спагнанне няўстойкі, штрафу, пені і іншых штрафных санкцый за датэрміновае вяртанне не дапускаецца.

Банкі таксама абавязалі бясплатна даваць пісьмовую інфармацыю аб кошце дадатковых платных паслуг. З фізічных асоб не павінна спаганяцца плата за інфармацыю пра ўмовы крэдытавання і разгляд заявы аб атрыманні крэдыту і іншых дакументаў, неабходных для гэтага, за адкрыццё банкаўскага рахунку і залічэнне на яго сум крэдыту, калі ўмовамі крэдытнага дагавора прадугледжана адкрыццё рахунку.

Як мінімум адзін з варыянтаў вяртання фізічнай асобай крэдыту з усіх прадугледжаных у крэдытным дагаворы павінен быць бясплатным. Палажэнні, якія датычацца крэдытавання фізічных асоб, уступілі ў сілу пасля 28 ліпеня.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэм'ер Італіі назваў «абсалютна слушнай» пазіцыю Трампа па магчымым аднаўленні G8



Джузэпэ Контэ таксама лічыць, што дыялог ЗША і Расіі мае фундаментальнае значэнне для сусветнай стабільнасці.

Пазіцыі прэзідэнта ЗША Дональда Трампа па размеркаванні абаронных выдаткаў краін — удзельніц НАТА і па магчымым вяртанні Расіі ў Групу сямі і аднаўленні фармату «васьмёркі» (G8) з'яўляюцца «абсалютна слушнымі», заявіў Джузэпэ Контэ падчас сумеснай з Трампам прэс-канферэнцыі ў Белым доме.

«Я асабіста падзяляю гэтыя пазіцыі. Шчыра кажучы, прэзідэнт выказаў пазіцыю і неабходнасць аднавіць раўнавагу ў выдатках НАТА, якія традыцыйна вельмі непрапарцыянальныя, гэта абсалютна слушныя пазіцыі», — адзначыў ён.

«Што датычыцца Расіі, Італія зацікаўлена ў дыялогу з Расіяй. Італія таксама лічыць, што дыялог паміж ЗША і Расіяй з'яўляецца фундаментальным для таго, каб дамагчыся станоўчых вынікаў у глабальнай перспектыве з пункту гледжання стабільнасці і бяспекі», — сказаў ён, дадаўшы, што неабходна «гарантаваць, што сістэма санкцый не ўплывае на грамадзянскую супольнасць, на эканоміку малых і сярэдніх прадпрыемстваў у Расіі».

### Паўночная і Паўднёвая Карэі пасварыліся з-за афіцыянтак. Мірны працэс на паўвостраве пад пагрозай

Паміж Пхеньянам і Сеулам паўсталі супярэчнасці з-за 12 паўночнакарэйскіх афіцыянтак, якія апынуліся ў Паўднёвай Карэі, паведамляе South China Morning Post.

Як піша выданне, гэтыя абставіны могуць негатыўна адбіцца на мірным працэсе на Карэйскім паўвостраве. Паўночнакарэйскія СМІ пісалі таксама пра тое, што ўцёкі дзяўчат могуць стаць перашкодай на шляху ўз'яднання сем'яў, падзеленых падчас Карэйскай вайны 1950—1953 гадоў.

Раней стала вядома, што афіцыянткі працавалі ў рэстаране, які належыць уладам КНДР, на тэрыторыі Кітая. У красавіку 2016 года яны трапілі ў Паўднёвую Карэю праз пасольства краіны з Малайзіі. Па версіі Сеула, дзяўчаты запрасілі палітычны прытулак. Аднак у Пхеньяне ўпэўнены, што іх вывезлі сілай, і патрабуюць вярнуць работніц на радзіму. Паўднёвакарэйская камісія па правах чалавека расследуе, як менавіта дзяўчаты трапілі ў Рэспубліку Карэя.

### Расія растлумачыла прабачаныя іншым краінам даўгі

Кіраўнік МЗС Сяргей Лаўроў заявіў, што Расія спісала даўгі часоў СССР шэрагу краін, паколькі гэтыя грошы наўрад ці дапамаглі б вырашэнню існуючых праблем. Пра гэта паведамляе ТАСС.

«Я не думаю, што тыя сумы, якія засталіся ў спадчыну ад Савецкага Саюза, вырашылі б нейкія ўнутраныя праблемы і дапамаглі б істотнаму іх вырашэнню, таму што гэтыя даўгі на 90 з лішнім працэнтаў былі незваротнымі», — заявіў Сяргей Лаўроў.

Акрамя таго, па словах Лаўрова, «юрыдычна вельмі цяжка даказаць», па якім курсе гэтыя даўгі пазычаліся. Тады, адзначыў ён, СССР не быў неад'емнай часткай міжнароднай валютна-фінансавай сістэмы, а курс рубля ўсталёўваўся Дзяржбанкам.

«Мы памятаем, калі долар каштаваў 63 капейкі, і, вядома, калі лічыць даўгі па гэтым курсе, а даўгоў Савецкі Саюз раздаваў нямала, перш за ўсё краінам, якія змагаліся супраць каланіялізму, за незалежнасць, а ў асноўным была ваенная дапамога, гэта было б далёка ад рэальнасці».

Таксама грошы часта выдаваліся арганізацыям, якія змагаліся за незалежнасць і якія па нормах міжнароднага права не з'яўляліся дзяржаўнымі суб'ектамі. У гэтых выпадках вярнуць даўгі не ўяўляецца магчымым, паколькі яны першапачаткова не абапіраліся на міжнародна-прававыя дамоўленасці, дадаў Лаўроў.

За апошнія 20 гадоў Расія спісала больш за 140 мільярдаў долараў замежным пазычальнікам. Кубе, у прыватнасці, даравалі 30 мільярдаў долараў, КНДР — 11 мільярдаў, краінам Афрыкі — 20 мільярдаў.

■ Ведай нашых!

# МЕДАЛЬНЫ «ЎРАДЖАЙ»

**Беларускія школьнікі працягваюць паспяхова выступаць на міжнародных інтэлектуальных спаборніцтвах. З Лісабона, дзе завяршылася 49-я міжнародная алімпіяда па фізіцы, нашы навучэнцы прывезлі два сярэбраныя і два бронзавыя медалі.**

Міжнародная алімпіяда па фізіцы (IPhO) з'яўляецца штогадовым конкурсам для навучэнцаў ва ўзросце да 20 гадоў. Акрамя тэарэтычных задач, яе ўдзельнікі вырашаюць таксама і эксперыментальныя задачы, што павышае складанасць спаборніцкага марафону і абумоўлівае правядзенне двух конкурсных тураў: яны праводзяцца ў розныя дні, на кожны з іх вылучаецца па пяць гадзін. Задачы для алімпіяды рыхтуюцца прадстаўнікамі краіны-арганізатара.


Прызёры міжнароднай алімпіяды па хіміі.

У Партугаліі выступалі 400 удзельнікаў з 90 краін. Узнагароды заваявалі ўсе чатыры прадстаўнікі беларускай зборнай: Яўген Ганковіч (выпускнік Ліцэя БДУ) і Яўген Дзядкоў (навучэнец барысаўскай гімназіі № 1) заваявалі сярэбраныя медалі, а Мікалай Зунікаў (Гомельскі гарадскі ліцэй № 1) і Уладзіслаў Фядурка (Ліцэй БДУ) былі ўзнагароджаныя «бронзай». Рыхтавалі каманду Анатоль Слабадзянюк (БДУ) і Леанід Марковіч (Ліцэй БДУ). А абсалютным пераможцам стаў юны фізік з Кітая.

Таксама чатыры ўзнагароды заваявалі беларускія школьнікі і ў Празе, якая прымала юбілейную 50-ю міжнародную алімпіяду па хіміі. Там канкурыравалі паміж сабой 300 школьнікаў з 76 краін.

Па ўмовах спаборніцтваў, кожную краіну можа прадстаўляць каманда ў складзе не больш як чатырох чалавек плюс два педагогі. Кіраўнікамі беларускай зборнай выступілі загадчык кафедры хімічнага факультэта БДУ Віктар Хвалюк і дацэнт той жа кафедры Аляксандр Рагойша. Міжнародная алімпіяда па хіміі таксама складаецца з двух тураў (тэарэтычнага і практычнага), якія доўжацца да пяці гадзін і праводзяцца ў розныя дні.

«Серабро» алімпіяды заваявала ў Празе выхаванка Ліцэя БДУ Паліна Булаўская. Бронзавыя ўзнагароды ў ліцэістаў БДУ Алега Караткова, Дзяніса Новаша і навучэнца сталічнай гімназіі № 29 Аляксея Грахоўскага.

Чатыры бронзавыя медалі заваявалі беларускія школьнікі таксама на міжнароднай алімпіядзе па біялогіі ў Іране і столькі ж — на міжнароднай матэматычнай алімпіядзе ў Румыніі. А ў Парыжы на X Міжнародным камандным турніры юных матэматыкаў адна беларуская каманда ўзяла «золата» і абсалютнае першае месца, а другая заваявала «бронзу».

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

# Дом для пляжнага футбола

**У сталіцы на тэрыторыі спартыўна-аздараўленчага комплексу «Алімпійскі» ўчора адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця Нацыянальнага стадыёна для пляжнага футбола. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства спорту і турызму, фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года», Беларускай федэрацыі футбола і Федэрацыі пляжнага футбола краіны.**



Будаўніцтва стадыёна пачалося ў чэрвені, работы вяліся ў сціслыя тэрміны і згодна з патрабаваннямі і пажаданнямі Міжнароднай федэрацыі пляжнага футбола. Былі ўлічаны ўсе заўвагі і прапановы гэтай арганізацыі. Новая арэна ў выглядзе падковы, якая ўмяшчае 1,5 тысячы гледачоў, дазволіць аматарам спорту ў камфортных умовахназіраць за займальнай гульнёй.

Ужо з 3 да 5 жніўня на новым стадыёне пройдзе першы турнір, Мінск упершыню прыме адзін з этапаў Еўралігі. Адзначым, што гэта галоўныя спаборніцтвы года для мужчынскіх нацыянальных камандаў па пляжным футболе ў Еўропе. На мінскім этапе паміж сабой будуць сапернічаць чатыры зборныя — Беларусі, Італіі, Польшчы і Турцыі. Нагадаем, на першым этапе Еўралігі ў азербайджанскім Баку беларусы, якіх трэніруе вядомы іспанскі спецыяліст Нікалас Альварада, выйгралі ў камандаў Азербайджана (4:1) і Францыі (3:2), але ўступілі Партугаліі (2:3). У агульным заліку Еўралігі зборная Беларусі займае цяпер 6-е месца, набраўшы шэсць ачкоў. Каманды Італіі і Польшчы маюць па тры заліковыя балы, турэцкая зборная не набрала ніводнага ачка ў трох праведзеных сустрэчах. Турнірную табліцу Еўралігі ўзначальваюць каманды Украіны і Партугаліі, якія набралі па 12 ачкоў у шасці матчах.

Маючыя адбыцца спаборніцтвы Еўралігі стануць тэставымі да турніру па пляжным футболе на II Еўрапейскіх гульнях у Мінску.

**Расклад гульняў:**

***3 жніўня***

Італія — Польшча (пачатак у 17.15), Беларусь — Турцыя (18.30)

***4 жніўня***

Турцыя — Італія (17.15), Беларусь — Польшча (18.30)

***5 жніўня***

Польшча — Турцыя (17.15), Італія — Беларусь (18.30).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ Чулі?!

# Азонавай дзіркі ўжо няма

## Еўрапейскае касмічнае агенцтва (ЕКА) паведамляе аб знікненні азонавай дзіркі над Антарктыдай

**Такія даныя атрыманы еўрапейскім касмічным апаратам Sentinel-5P у ходзе даследавання атмасферы, гаворыцца на сайце агенцтва. Гэта толькі першасныя весткі з гэтага касмічнага апарата, размешчаныя ў адкрытым доступе. Ці азначае гэта, што ў будучыні дзірка не ўтворыцца зноў, пакуль незразумела.**

Азонавая дзірка над Антарктыдай — адна з сур'ёзных пагроз глабальнай экасістэме, паколькі без азонавага пласта Зямля безабаронная перад шкодным ультрафіялетавым выпраменьваннем Сонца. «Першыя азонавыя здымкі праграмы Sentinel-5P паказваюць закрыццё азонавай дзіркі над Паўднёвым полюсам у лістападзе 2017 года», — гаворыцца ў паведамленні, апублікаваным на сайце ЕКА. Да звестак прыкладаецца пасутквы малюнак, згодна з якім азонавая дзірка, якая ахоплівае палову Антарктыды, зацягнулася да 26 лістапада мінулага года.

Рэзкае падзенне канцэнтрацыі азону ў стратасферы (азонавая дзірка) было ўпершыню выяўлена над Антарктыдай у 1980-х гадах. Разбурэнне азону (трохатамных малекул кіслароду) звязана з уздзеяннем рэчываў групы вугляродаў, найбольш вядомымі з якіх з'яўляецца група фрэонаў.

Навуковае пацвярджэнне факта памяншэння азонавага пласта заахвоціла міжнародную супольнасць стварыць механізм супрацоўніцтва па прыняцці мер для яго абароны. У 2014 годзе даследаванне, падрыхтаванае экспертамі Праграмы ААН па навакольным асяроддзі і Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі, паказала, што дзякуючы адмове ад шэрагу хімічных рэчываў аднаўленне азонавага пласта адбудзецца ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі.

Эксперты адзначаюць, што вывядзенне з ужывання разбуральных азон рэчываў дапамагае таксама і ў барацьбе са зменай клімату, бо многія хімічныя рэчывы, кантраляваныя дагаворам, былі прызнаныя таксама крыніцамі глабальнага пацяплення.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ЗАПРАШАЕ ВЫСТАЎКА ЧЫГУНАЧНЫХ МАДЭЛЯЎ

**4 і 5 жніўня на Дзіцячай чыгунцы імя К. С. Заслонава будзе арганізавана міжнародная выстаўка чыгуначных мадэляў «Беларускі модуль — 2018». Яна пройдзе ў зале чакання вакзала станцыі «Заслонава».**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, у выстаўцы прымуць удзел каля 20 мадэлістаў з Беларусі, Расіі і Украіны. Тут будуць прадстаўлены вялікі дзеючы макет чыгункі, шматлікія мадэлі рухомага саставу розных эпох, адпаведная інфраструктура ў маштабе 1:87. Трэба адзначыць, што ўсе мадэлі выкананыя іх аўтарамі самастойна.

Выстаўка будзе працаваць з 11.00 да 16.30, уваход бясплатны.

Таксама 4 і 5 жніўня з 11.00 да 16.40 па Дзіцячай чыгунцы будзе курсіраваць цягнік «Сталічны экспрэс». Ён правязе пасажыраў па традыцыйным маршруце: ад станцыі «Заслонава» праз станцыю «Піянерская» да станцыі «Сасновы Бор» і назад. Нагадваем, што ў жніўні пракацішца на цягніку па Дзіцячай чыгунцы можна будзе па серадах, чацвяргах і пятніцах з 11.00 да 14.00, а па суботах і нядзелях — з 11.00 да 16.40, у верасні — па суботах і нядзелях з 11.00 да 16.40.

## МАЛЫЯ ПАД КОЛАМІ І ПРЫЧЭПАМ

**Апошнія дні зноў былі азмрочаны здарэннямі з удзелам дзяцей.**

Так, сямігадовая дзяўчынка трапіла пад колы мінівэна ў Капылі. Па інфармацыі УДАІ УУС Мінскага аблвыканкама, аварыя адбылася ўдзень. 41-гадовы мясцовы жыхар на Ford Galaxy наехаў на дзяўчынку, жыхарку Капыльскага раёна, якая раптоўна выбегла на праезную частку. У выніку ДТЗ дзіця атрымала траўмы і было шпіталізавана ў рэанімацыйнае аддзяленне. Кіроўца быў цвярозы і прышпілены рэменем бяспекі.

А ў Баранавіцкім раёне на чатырохгадовую дзяўчынку зваліўся прычэп ад легкавога аўтамабіля. Па інфармацыі ўпраўлення Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці, гэты няшчасны выпадак адбыўся ўвечары ў вёсцы Лотвічы. У Баранавіцкі РАУС з гарадской бальніцы паступіла паведамленне аб траўмаванні маленькага дзіцяці. Дзяўчынка разам з бацькамі гасцявала ў бабулі. Дарослыя былі ў доме, малая ў гэты час адна гуляла ў двары. Яна залезла пад двухвосевы аўтамабільны прычэп, які стаяў на ўчастку. Счэпная прылада звалілася, ударыўшы дзяўчынку па галаве і спіне. Пацярпелая знаходзіцца ў рэанімацыі. Праводзіцца праверка. Следчыя высвятляюць усе акалічнасці здарэння. Прызначана судова-медыцынская экспертыза.

## МІНА ПАД... ПАДЛОГАЙ ДОМА

**У Докшыцкім раёне ў прыватным доме пры замене падлогі знайшлі проціпяхотную міну.**

Гэта адбылося ў жыллі даваеннай пабудовы ў гарадскім пасёлку Бягомль. Сям'я вырашыла перакласці падлогу. У працэсе работ пасля падняцця драўлянага насцілу ўладальнікі жылля ўбачылі падазроны прадмет, які тырчаў з землянога насыпу. Пра сваю знаходку яны паведамілі ў міліцыю. Сапёры, якія прыбылі на месца, дасталі з падпамосся проціпяхотную міну часоў вайны, аб наяўнасці якой жыхары нават не падазравалі. Па інфармацыі сапёраў, да пэўнага моманту боепрыпас умоўна быў бяспечны, аднак пры ўдары ў выпадку пралому падлогі ў гэтым месцы або пажары ён мог узарвацца. Міну вывезлі ў бяспечнае месца і знішчылі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Рука дапамогі

# «У школу з Добрым Сэрцам»

## БРСМ распачынае аднайменную дабрачынную акцыю

**З 1 жніўня да 15 верасня ва ўсіх рэгіёнах краіны пройдуць мерапрыемствы агульнарэспубліканскай дабрачыннай акцыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «У школу з Добрым Сэрцам», падчас якіх валанцёры БРСМ акажуць адрасную сацыяльную падтрымку сем'ям, якія маюць цяжкасці пры падрыхтоўцы школьнікаў да навучальнага года.**

Сваёй акцыяй БРСМ падтрымае шматдзетныя і няпоўныя сем'і. Традыцыйна акажа дапамогу і дзіцячым інтэрнатным установам.

Для збору школьных рэчаў у буйных гандлёвых цэнтрах краіны актывісты саюза моладзі арганізуюць адмысловыя пункты. Прыняць удзел у дабрачынным праекце запрашаюць усіх ахвотных. Для скарбонкі агульнай добрай справы спатрэбіцца ўсё: канцылярскія і спартыўныя прылады, наборы для дзіцячай творчасці, развівальныя настольныя гульні, навучальныя дапаможнікі, школьнае адзенне, абутак і г. д.

Сёлета старт акцыі «У школу з Добрым Сэрцам» дадуць валанцёры Гомельшчыны. 1 жніўня мерапрыемствы па зборы школьных прылад будуць арганізаваны ва ўсіх раёнах вобласці: у Жыткавічах — у «Дзіцячым свеце», у Калінкавічах — у доме гандлю «Бярозка», у Навабеліцы — у краме «Белкніга» і г. д. Цэнтральнае мерапрыемства пройдзе на адкрытай пляцоўцы каля універмага «Гомель», дзе з 12.30 да 14.00 валанцёры «Добрага Сэрца» Гомельскай гарадской арганізацыі БРСМ установяць «Кошык дабра». Прыцягнуць увагу наведвальнікаў універмага да акцыі дапамогуць роставыя лялькі, клоўны і аніматары.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

■ Справы судовыя

# МЕНШ АСУДЖАНЫХ, БОЛЬШ АДМОЎ У ІСКАХ

**Вытрымліванне прэзумпцыі добрасумленнасці, апеляцыйнае абскарджанне, узмацненне жорсткасці патрабаванняў да судовага корпуса і іншыя змены адбыліся сёлета ў рабоце судоў агульнай юрысдыкцыі. Пра вынікі паўгадавой работы расказаў Валерый КАЛІНКОВІЧ, першы намеснік старшыні Вярхоўнага Суда Беларусі.**

За паўгода сёлета асуджана больш за 20 тысяч асоб, а апраўдана 43 чалавекі. Лідарамі ў спісе правапарушэнняў, як і раней, застаюцца крадзяжы маёмасці і ўхіленне бацькоў ад утрымання дзяцей ці пакрыцця расходаў дзяржавы па доглядзе малых. Пры гэтым у параўнанні з першым паўгоддзем 2017-га за такі ж перыяд сёлета крыху знізілася колькасць крымінальных, эканамічных спраў і спрэчак, а таксама спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях, якія паступілі для разгляду.

Валерый Калінковіч засведчыў, што змяншэнне колькасці асуджаных — лагічны вынік паслядоўнага скарачэння ў апошнія гады ліку зарэгістраваных злачынстваў. Разам з тым паменшала і тых, каго пазбавілі волі.

Сёлета ў дзейнасці эканамічнага правасуддзя практычна рэалізаваны палажэнні Дэкрэта Прэзідэнта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва», сярод якіх вытрымліванне прынцыпу прэзумпцыі добрасумленнасці суб'ектаў гаспадарання, карэкціроўка падыходаў да субсідыярнай адказнасці і скарачэнне сферы прымянення мер адміністрацыйнай адказнасці ў эканоміцы, падкрэсліў ён.

Згодна з дэкрэтам, цяпер заснавальнікі і службовыя асобы суб'ектаў гаспадарання, якія сталі банкрутамі, адказваюць за эканамічную неплацежаздольнасць толькі тады, калі яна была выклікана наўмыснымі дзеяннямі гэтых асоб. Праз такія змены ў параўнанні з такім жа мінулагоднім перыядам колькасць адмоў судоў у задавальненні іскаў па гэтай катэгорыі спраў узрасла ў сем разоў і ў тры разы павялічылася лічба спраў, якія суддзі пакінулі без разгляду. Адмоўлена ў ісках у 65,7 % спраў, без разгляду засталіся 16,4 %.

Як і раней, у судах агульнай юрысдыкцыі працягваюць праводзіць мерапрыемствы па паляпшэнні агульнай арганізацыі работы судоў, стварэнні належных умоў для арганізацыі правасуддзя і забеспячэння бакам права на судовую абарону.

— Прымаюцца меры па папярэджанні фактаў судовай цяганіны, калі асобныя справы працягваюцца доўга без істотных падстаў. А таксама па забеспячэнні выканання суддзямі і іншымі работнікамі судовага апарату патрабаванняў, якія сёння прад'яўляюцца да паводзін, ладу жыцця і выканання службовых абавязкаў у судовай сістэме, — падкрэсліў першы намеснік старшыні Вярхоўнага Суда.

Ён дадаў, што патрабаванні да кандыдатаў у супрацоўнікі судовага корпуса таксама робяцца больш жорсткімі ў плане агульнай прававой падрыхтоўкі і асабістых маральных і дзелавых якасцяў:

— Назначэнню на пасаду суддзі, хай сабе гэта будзе і вельмі таленавіты юрыст, павінна з гэтага паўгоддзя папярэднічаць працяглая стажыроўка ў адным з судоў, па выніках якой і будзе прымацца канчатковае рашэнне.

Сур'ёзна рыхтаваліся суды і да ўступлення ў сілу закона (новая рэдакцыя запрацавала з 23 ліпеня), якім меркавалася ўнесці змены і дапаўненні ў Грамадзянскі працэсуальны кодэкс. У прыватнасці, што датычыцца пераходу да апеляцыйнага парадку абскарджання судовых пастаноў па грамадзянскіх справах.

— У абноўленай рэдакцыі закон стварае ўсе ўмовы, каб канчатковыя рашэнні па грамадзянскіх спрэчках у выпадку абскарджання рашэнняў судоў першай інстанцыі прымаліся ў апеляцыі без паўторных судовых разбораў і шматлікіх выклікаў бакоў і сведак, — растлумачыў Валерый Калінковіч. — У той жа час закон заклікаваны замацаваць спаборны пачатак грамадзянскага працэсу, дысцыплінаваць цяжэбныя бакі і зрабіць працэсуальна нявыгаднай тактыку зацягвання разбору праз нядачу ці ўтойванне доказаў ад суда першай інстанцыі. Цяпер гэта непазбежна будзе весці да пройгрышу судовай спрэчкі.

Суды таксама працягваюць вывучаць магчымасці ўніфікацыі палажэнняў грамадзянскага і гаспадарчага працэсу для распрацоўкі ў выніку адзінага Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса. Каб быў практычны вынік, спатрэбіцца яшчэ час.

**Ірына СІДАРОК**

# ПАРКОЎКА ПА ПРАВІЛАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Зоны ахопу «Паркрайта» не перасякаюцца з тымі, дзе працуюць эвакуатары. Дарэчы, пры іх выбары ўлічваецца сукупнасць мноства фактараў: транспартная абстаноўка, арганізацыя дарожнага руху і нават наяўнасць дазволеных месцаў для паркоўкі ў непасрэднай дасяжнасці. У Мінску, напрыклад, адной з такіх зон стала тэрыторыя каля Камароўскага рынку — месца прыцягнення тысяч машын. Паблізу знаходзіцца платныя паркоўкі, аднак кіроўцы кідаюць аўтамабілі ў не прызначаных для гэтага месцах, не зважаючы на тое, што гэта стварае небяспечную сітуацыю пры пераходзе пешаходнага перахода, можа замінаць праезду пажарнай машыны або хуткай дапамогі, не кажучы ўжо пра тое, што становіцца прычынай узнікнення пастаянных затораў на дарозе ў час пік.

Прыборы пачалі прымяняць у сакавіку, два месяцы пайшло на тое, каб іх апрабаваць. З канца мая з дапамогай «Паркрайта» было вынесена больш за дзве тысячы пастаноў, прычым каля 75% з іх прыйшлося на сталіцу. Усе выпадкі падвяргаюцца пільнаму аналізу. Так, адзін і той жа аўтамабіль быў зафіксаваны сістэмай 12 разоў. Аказалася, што яго ўладальнік працуе непадалёк і прывык пакідаць аўтамабіль на адным і тым жа месцы. Пасля асабістай размовы з супрацоўнікамі ДАІ ён паабяцаў знайсці іншы варыянт паркоўкі і расказаць пра неабходнасць зрабіць тое ж самае сваім калегам. У падобных выпадках прафілактычныя гутаркі будуць прымяняцца абавязкова.

Супрацоўнікі ДАІ ўскладаюць на новы прыбор вялікія спадзяванні. Тым больш што ён працуе па падобным прынцыпе з сістэмай аўтаматычнай фіксацыі парушэнняў хуткаснага рэжыму, якая праявіла сябе з найлепшага боку. Сістэму пачалі ўкараняць у 2012-м. І калі за год да гэтага колькасць аварый, якія адбыліся з прычыны перавышэння хуткасці, склала 1045, то да 2017 года іх колькасць знізілася да 397.

Дарэчы, магчымасці «Паркрайта» значна шырэйшыя, чым толькі фіксацыя парушэнняў правілаў стаянкі і паркоўкі транспартных сродкаў. Такім чынам, пры ўстаноўцы адпаведнага праграмнага забеспячэння яна можа фіксаваць праезд на забараняльны сігнал святлафора, перасячэнне суцэльнай лініі разметкі, аналізаваць нумарныя знакі і рэагаваць на тыя аўтамабілі, якія лічацца ва ўгоне. Калі навінка сябе добра зарэкамендуе, у перспектыве дыяпазон яе дзеяння будзе пашырацца.

А пакуль праблемай няправільнай паркоўкі працягваюць займацца асабіста супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі. Так, інспектары ДАІ разам з Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і спецыялістамі раённых адміністрацый праводзяць акцыю «Я паркуюся, як...», што стала ўжо традыцыйнай. Заўтра, напрыклад, імі будзе праверана дваровая тэрыторыя па сталічнай вуліцы Залатая Горка. Машыны самых злосных парушальнікаў правілаў паркоўкі будуць эвакуіраваны. Нароўні з выяўленнем фактаў стаянкі аўтатранспарту на зялёных зонах сярод асноўных задач — выпрацоўка канкрэтных прапаноў па разгрузцы дваровай тэрыторыі ад машын.

А пакуль праблемай няправільнай паркоўкі працягваюць займацца асабіста супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі. Так, інспектары ДАІ разам з Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і спецыялістамі раённых адміністрацый праводзяць акцыю «Я паркуюся, як...», што стала ўжо традыцыйнай. Заўтра, напрыклад, імі будзе праверана дваровая тэрыторыя па сталічнай вуліцы Залатая Горка. Машыны самых злосных парушальнікаў правілаў паркоўкі будуць эвакуіраваны. Нароўні з выяўленнем фактаў стаянкі аўтатранспарту на зялёных зонах сярод асноўных задач — выпрацоўка канкрэтных прапаноў па разгрузцы дваровай тэрыторыі ад машын.

**Дар'я КАСКО.**

■ На слыху

# ПАД МІНСКАМ ПРАХОДЗІЛІ СВІНГ-ВЕЧАРЫНКІ

**У пасёлку Бараўляны Мінскага раёна супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС палажылі канец дзейнасці падпольнага бардэля. Аперацыя па яго ліквідацыі праходзіла пры падтрымцы спецатрада хуткага рэагавання МУС.**

Папярэдне было ўстаноўлена, што з 2016 да 2018 года двое непрацуючых мінчан здымалі катэдж для праведзення за ўзнагароджанне закрытых секс-вечарынак. Кліентаў шукалі сярод знаёмых, праз аб'явы ў інтэрнэце, сацсетках і месенджарах. Па інфармацыі МУС, кошт уваходу для мужчын складаў ад 200 да 370 рублёў, для пары — 120 рублёў. Прадстаўніцы слабага полу ўдзельнічалі ў «мерапрыемстве» бясплатна. У далейшым пастаянным членам клуба даваліся зніжкі. Грошы наведвальнікі пераводзілі на картку, мабільны тэлефон або перадавалі асабіста арганізатарам.

Акрамя выпадковых удзельнікаў, на вечарынках прысутнічалі прастытуткі, вядучыя тэматычных конкурсаў, бармены і іншыя прадстаўнікі абслугоўвага персаналу, паслугі якіх уваходзілі ў кошт наведвання. Таксама ў аплату ўключаўся алкаголь, ежа, карыстанне саўнай і басейнам.

На момант спецаперацыі ў катэджы знаходзіліся 34 мужчыны і 18 дзяўчат, сярод якіх былі сямейныя пары і студэнты. Узрост удзельнікаў вар'іраваўся ад 20 да 45 гадоў.

У дачыненні да арганізатараў падпольнага бардэля 1979 і 1987 гадоў нараджэння Мінскім РАСК заведзена крымінальная справа за арганізацыю і (або) выкарыстанне заняцця прастытуцыяй або стварэнне ўмоў для заняцця прастытуцыяй.

Зараз праводзяцца далейшыя следчыя дзеянні і аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, скіраваныя на ўстанаўленне ўсіх абставін і дадатковых фактаў супрацьпраўнай дзейнасці падазраваных.

У МУС адзначылі, у Беларусі падобныя «мерапрыемствы» сталі набіраць абароты. Ёсць інфармацыя, што розныя свінг-вечарынкі з элементамі БДСМ, тэматычнымі распуснымі конкурсамі, удзелам прадстаўнікоў нетрадыцыйных сексуальных поглядаў маглі арганізоўвацца ў многіх рэгіёнах краіны. Гэтыя звесткі правяраюцца праваахоўнікамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

УТВЕРЖДЕНО
Решение Общего собрания
участников Общества
с ограниченной ответственностью
«ДЕКО-ПЛАСТ»
4 июля 2018 г. № б/н

ИЗМЕНЕНИЯ
в Проспект эмиссии жилищных
облигаций второго, пятого
и шестого выпусков Общества
с ограниченной ответственностью
«ДЕКО-ПЛАСТ»

Пункт 1.11 изложить в следующей редакции:
«.11. Сведения об исполнительном органе эмитента
Директор эмитента – Ставер Сергей Петрович (приказ о вступлении в должность от 1 июня 2018 г. № 21-к).

| Занимаемые должности вне органов управления эмитента в настоящее время: |
| --- |
| первый заместитель директора ООО «ТАПАС ПЛЮС» |

Доли в уставном фонде Эмитента, а также в его дочерних и зависимых хозяйственных обществах не имеет.».

Директор ООО «ДЕКО-ПЛАСТ» С. П. Ставер

Главный бухгалтер
ООО «ДЕКО-ПЛАСТ» И. А. Голубь
УНП 600422579

УТВЕРЖДЕНО
Решение Общего собрания участников Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ»
4 июля 2018 г. № б/н

ИЗМЕНЕНИЯ
в Проспект эмиссии жилищных
облигаций восьмого – десятого,
двенадцатого и тринадцатого
выпусков Общества с ограниченной
ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ»

Пункт 1.12 изложить в следующей редакции:
«11.12. Сведения об исполнительном органе эмитента
Директор эмитента – Ставер Сергей Петрович (приказ о вступлении в должность от 1 июня 2018 г. № 21-к).

| Занимаемые должности вне органов управления эмитента в настоящее время: |
| --- |
| Первый заместитель директора ООО «ТАПАС ПЛЮС» |

Доли в уставном фонде Эмитента, а также в его дочерних и зависимых хозяйственных обществах не имеет.».
Пункт 1.19 изложить в следующей редакции:
«1.19 Перечень руководящих должностных лиц эмитента

Директор эмитента – Ставер Сергей Петрович.
Главный бухгалтер Эмитента – Голубь Инна Александровна.».

Директор ООО «ДЕКО-ПЛАСТ» С. П. Ставер

Главный бухгалтер
ООО «ДЕКО-ПЛАСТ» И. А. Голубь
УНП 600422579

# ТЭРЫТОРЫЯ БЯСПЕКІ




(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Крызісны пакой пры Магілёўскім раённым цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва працуе з 2007 года. За больш чым 10 гадоў тут пабывала шмат народу. Некаторыя нават па некалькі разоў. Не так даўно тут жыла жанчына, якую ратавалі ад замаху неадэкватнага сына. Накіраванне яна атрымала ад упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага райвыканкама. Зараз пакоем карыстаецца іншая жанчына, якая нарадзіла чацвярых дзяцей.

— Колькі мы з ёй у свой час павазіліся, лепш не ўспамінаць, — уздыхае загадчыца аддзялення. — Звязалася з гвалтаўніком, які біў яе як толькі мог. Але яна доўга адмаўлялася пісаць на яго скаргу. І толькі калі нарэшце зразумела, што праз гэтага чалавека страціла дзяцей, узялася за розум. Былі праблемы з алкаголем, але зараз ні-ні. І працаваць пайшла.



## Пад грыфам «сакрэтна»

Дзе знаходзіцца крызісны пакой — сакрэт. Гэта на той выпадак, каб гвалтаўнік не знайшоў патаемнае месца. Нават не ўсе супрацоўнікі ведаюць, дзе гэты пакой. А тыя, каму па родзе службы неабходна ведаць, падпісваюць паперу аб захаванні тайны. Такія ж правілы распаўсюджваюцца і на тых, хто там часова пражывае.

Мы не збіраемся рассакрэчваць месца. Скажам толькі, што гэта нават не пакой, а цэлая аднапакаёўка з усімі выгодамі ў шматкватэрным доме за горадам. Разам са спецыялістам накіроўваемся па названым адрасе. На парозе нас сустракае маладая хударлявая жанчына. Для яе адной прасторныя апартаменты здаюцца наогул шыкоўнымі. У вялікай зале стаяць адразу тры канапы. «Гэта на той выпадак, калі сюды трапляе нехта з дзецьмі», — тлумачыць Іна Івашына. Акрамя мяккай мэблі тут ёсць шафа, тэлевізар, стол з крэслам і нават камп'ютар. У шафе можна знайсці бялізну і цацкі для дзятвы. Тут сапраўды адчуваеш сябе абароненым ад знешніх пагроз.

Іна Івашына кліча ацаніць кухню. І тут таксама ёсць чаму ўразіцца. Кухонны гарнітур, халадзільнік, поўны камплект посуду, ёсць нават некаторыя прадукты. Бо невядома яшчэ, пасля якіх выпрабаванняў сюды трапіць чарговая ахвяра. Да паслуг часовага пастаяльца сучасны санвузел з наборам ручнікоў, абстаўленая ўсім неабходным пярэдняя. Адным словам, не ў кожнага яшчэ такія ўмовы дома.

У дапамогу чалавеку, які трапіў сюды, — нумары тэлефонаў карысных службаў. У асобнай папцы Палажэнне аб крызісным пакоі, правілы прыбывання ў ім, графік дзяжурстваў спецыялістаў, пералік паслуг, якія прапануе служба, буклеты з класіфікатарам розных відаў гвалту.

## Ахвяра гвалту

Жанчына, якая зараз тут жыве, сціпла называе сваё імя: Тамара. Яна адна з тых, хто моўчкі пераносіць пакуты і нават не крыўдзіцца на свайго мучыцеля. Апошні раз ён так жорстка збіў яе, што яна трапіла на бальнічны ложак. Жанчына атрымала сур'ёзную чэрапна-мазгавую траўму, недалічылася некалькіх пярэдніх зубоў. Пабоі цярпела на працягу некалькіх гадоў. Сужыцель — яе аднавясковец, да знаёмства з Тамарай паспеў пабываць за кратамі. Узаконьваць адносіны з новай знаёмай не стаў, проста пераехаў да яе на пастаяннае месца жыхарства. На працягу пяці гадоў яна нарадзіла трох дзяцей, але гэта сям'ю не згуртавала. Тамара кажа, што спачатку жылі больш-менш мірна, а потым сужыцель стаў усё часцей распускаць рукі.

— Апошні год піў амаль кожны дзень. Прыходзіў дадому і пачынаў качаць правы. То не тое прыгатавала, то не так падала, — прычыны браў з паветра, — жанчына расказвае гэта механічна з сумнай усмешкай на вуснах, углядваючыся кудысьці ў прастору.

Пасля таго як айчым жорстка збіў пасынка, сына Тамары ад першага шлюбу, сям'ю наведала камісія ад



адукацыі, паглядзела, як жывуць астатнія дзеці. Нехта заўважыў сіняк на целе зусім яшчэ маленькага хлопчыка, і дзяцей забралі. У Тамары быў шанц пазбавіцца ад свайго мучыцеля і паспрабаваць адстаяць малых. Але яна чамусьці наадрэз адмовілася пісаць на сужыцеля заяву.

## Даўгавая яма

Зараз Тамара сцвярджае, што перагледзела свае адносіны і гатова пісьмова пацвердзіць, што чалавек, з якім яна жыла, сапраўды гвалтаўнік. У гэтым выпадку яго чакае сур'ёзнае пакаранне. Як прызнаецца жанчына, яна стамілася так жыць і хоча вярнуць дзяцей. Самага маленькага, васьмімесячнага Паўла, яна нядаўна наведвала ў Доме дзіцяці, а вось з астатнімі сувязь абарвалася. Старэйшы зараз пад апекай у іншай сям'і, трохгадовага Дзіму і двухгадовую Надзею, няўпэўнена кажа жанчына, здаецца, усынавілі. На працягу апошняга года сувязі з дзецьмі яна не падтрымлівала. «Спачатку паспрабую вярнуць Паўлюшу, а там як атрымаецца», — разважае жанчына.

Сацыяльныя работнікі яе падбадзёрваюць, настройваюць на пазітыўны лад. «Калі на працягу года ты працуеш, не ўжываеш алкагольныя напоі, не вядзеш амаральны лад жыцця, можна звяртацца ў суд, каб вярнуць дзяцей, — кажа Іна Івашына. — Калі школа і ўсе іншыя зацікаўленыя службы давераць табе выхаванне малых, можна спадзявацца на поспех».

Жанчына ўголас марыць пра будучыню і пры гэтым сарамліва прыкрывае далонню свой часткова бяззубы рот. Тамары ўсяго 31 год, трэба было б заняцца сабой, але грошай на ўсё не хапае. Жыве яна ўсяго на 150 рублёў у месяц. Каля 70 %



ад яе заробку ідзе на ўтрыманне малых. І нават гэтых грошай не стае, каб цалкам пагасіць доўг перад дзяржавай. На ўтрыманне аднаго дзіцяці трэба прыкладна 260 рублёў, а ў жанчыны іх чацвёра. У выніку доўг пастаянна накопліваецца. Калі б было ўстаноўлена бацькоўства, частку грошай спаганялі б і з сужыцеля. Але Тамара пакуль да гэтага рашэння не саспела.

## Калі гвалтаўнік — ахвяра

Сумных гісторый пра жыхароў крызіснага пакою можа хапіць не на адну кнігу. Кватэра наогул рэдка пустуе. Сёлета тут пэўны час жыла пенсіянерка, якая пакутавала ад дарослага сына. Калі напіваўся, перыядычна пускаў у ход кулакі і пагражаў забіць. Жанчына некалькі месяцаў здымала ў Магілёве кватэру, але хутка зразумела, што на яе пенсію так доўга не пражывеш. Пасля чарговага скандалу пайшла ў райвыканкам па дапамогу. У выніку яе засялілі ў крызісны пакой, а сына за гвалт у сям'і пасадзілі на 15 сутак. У адносінах да яго вынесена ахоўнае прадпісанне. Гэта значыць, што на працягу месяца ён не мае права з'яўляцца дома і набліжацца да маці, якую крыўдзіў. Зараз у адносінах да яго распачата крымінальная справа, ёсць спадзяванні, што некалькі гадоў маці зможа жыць спакойна.

Правы на пражыванне ў крызісным пакоі атрымліваюць не толькі ахвяры гвалту. Напрыклад, у сакавіку тут жылі пенсіянеры, у якіх згарэў дом. Як толькі яго адбудавалі, сужэнцы пераехалі. Права на пражыванне можа атрымаць нават... гвалтаўнік. Калі выносіцца ахоўнае прадпісанне, чалавек не мае права набліжацца да свайго дома, калі там жыве яго ахвяра. Атрымліваецца, што ён сам застаецца без даху над галавой. Але выйсце ёсць. Ён можа звярнуцца да сацыяльных работнікаў і атрымаць права на часовае пражыванне ў крызісным пакоі. Прычым скарыстацца паслугай можна ў любы дзень і нават час сутак. «Выхадныя і святочныя дні не перашкода, наш тэлефон працуе кругласутачна», — удакладняе мая суразмоўніца.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Сацыяльная кансультацыя

# ДАПАМОГА НА ДЗЯЦЕЙ, СТАРЭЙШЫХ ЗА ТРЫ ГАДЫ

**Некаторыя сем'і маюць права на атрыманне дапамогі на дзяцей, старэйшых за 3 гады. Пра тое, што гэта за сем'і і ў якіх выпадках яны могуць разлічваць на такую падтрымку ад дзяржавы, мы запыталіся ў намесніка начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Беларусі Марыны АРЦЁМЕНКІ.**

## Калі ў сям'і некалькі непаўналетніх дзяцей

Права на дапамогу на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў маюць маці (мачаха) або бацька (айчым) у поўнай сям'і, хтосьці з бацькоў у няпоўнай сям'і, усынавіцель (удачарыцель), апякун (папячыцель), якія выхоўваюць адначасова дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — і ад 3 да 18 гадоў.

Пры гэтым дапамога на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў прызначаецца ў памеры 50 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму.

Пры выхаванні ў сям'і дваіх і больш дзяцей дзяржаўная дапамога, прадугледжаная гэтым артыкулам, прызначаецца і выплачваецца адна на сям'ю.

## Дапамога для асобных катэгорый сем'яў

Дапамога на дзяцей, старэйшых за тры гады, з асобных катэгорый сем'яў, прызначаецца, калі ў сям'і:

— выхоўваецца дзіця-інвалід ва ўзросце да 18 гадоў;

— выхоўваецца дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванне вірусам імунадэфіцыту чалавека;

— бацька (айчым) або усынавіцель (удачарыцель) з'яўляюцца ваеннаслужачымі, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу;

— абодва бацькі (альбо мачаха і айчым) у поўнай сям'і, альбо адзіны з бацькоў у няпоўнай сям'і, усынавіцель (удачарыцель) з'яўляюцца інвалідамі І ці ІІ групы, а таксама калі адзін з бацькоў у поўнай сям'і з'яўляецца інвалідам І групы, а другі ажыццяўляе догляд за ім і атрымлівае з гэтай нагоды дапамогу, прадугледжаную заканадаўствам.

**○ У ТЭМУ**

### ВЫРАС БПМ — ВЫРАСЛІ ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ

З 1 жніўня павысіліся памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

— Дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў (штомесячная) цяпер складзе 106,84 руб.

— Дапамога на дзяцей, старэйшых за тры гады для асобных катэгорый сем'яў (штомесячная):

на дзяцей старэйшых за тры гады, якія выхоўваюцца ў такіх сем'ях (акрамя дзіцяці-інваліда), на кожнае дзіця — 106,84 руб.;

на дзіця-інваліда, старэйшае за тры гады — 149,57 руб.

## Памер выплат

Дапамога на дзяцей, старэйшых за тры гады, з асобных катэгорый сем'яў прызначаецца на кожнае дзіця ў памеры 50 % бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу (БПМ), а на дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў — у памеры 70 % БПМ.

## Умовы прызначэння дапамогі

Дапамога на дзяцей, старэйшых за тры гады, з асобных катэгорый сем'яў прызначаецца, калі на дату звароту па яе, а таксама не менш за шэсць месяцаў увогуле ў каляндарным годзе, які папярэднічаў году звароту па такую дапамогу, працаздольны бацька (айчым) у поўнай сям'і альбо хтосьці з працаздольных бацькоў у няпоўнай сям'і працаваў ці ажыццяўляў іншы від дзейнасці.

## Майце на ўвазе

Пры звароце па згаданую дапамогу па заканчэнні шасці месяцаў з дня ўзнікнення права на яе, дапамога прызначаецца з дня звароту.

Святлана БУСЬКО ■

**○ ДАРЭЧЫ**

**Дапамога па доглядзе за дзіцем да трох гадоў:**

— на першае дзіця — 35 % сярэднямесячнай зарплаты ў краіне за квартал (СЗП) — 329,04 руб.;

— на другое і наступных дзяцей — 40 % СЗП — 376,04 руб.;

— на дзіця-інваліда да трох гадоў — 45 % СЗП — 423,05 руб.

# НЕ СУДЗІЦЦА, А МІРЫЦЦА

## Можна вырашыць усё, калі спрачальнікі згодны размаўляць

**«Мама, з табой і татам нарэшце стала можна гаварыць, вы пачалі мяне разумець», — казаў 13-гадовы Данік сваім бацькам, якіх яшчэ тры месяцы таму ненавідзеў, і нават падумваў уцячы з дому... «Якога цуда мы маглі не дачакацца», — думала Насця, пазіраючы на сваю пяцімесячную дачку і мужа, з якім паўтара года назад яны прыйшлі ў сталічны загс з цвёрдым намерам скасаваць шлюб праз чатыры месяцы пасля вяселля... Шчаслівы працяг гэтыя і мноства іншых гісторый набылі пасля таго, як іх удзельнікі пагадзіліся сустрэцца з медыятарамі. У выніку аказалася, што менавіта гэтых спецыялістаў ім не хапала, каб зразумець адно аднаго і адважыцца сабе дапамагчы.**

### Дамовіцца з іншымі і самім сабой

Дарослых людзей ужо нельга змяніць, аднак можна нагадаць ім пра наяўнасць будучыні і дапамагчы яе палепшыць, упэўнены медыятары — тыя, хто дапамагае варожым бакам дамовіцца і зберагчы свае нервы, сродкі і час. Закон аб медыяцыі з'явіўся ў Беларусі ў 2014 годзе, а адпаведныя спецыялісты сталі атрымліваць пасведчанні медыятараў. Аднак працаваць у гэтай галіне некаторыя пачалі ў нас больш за дзесяць гадоў таму, дапамагаючы людзям не давесці свае праблемы да суда.

А сёлета ў сталіцы прайшоў ужо ІІІ Міжнародны фестываль медыяцыі, які паказаў, што з кожным годам павялічваецца разуменне людзей, што медыяцыя — добрая сцяжынка, якая вядзе не ў суд, а да міру. Расце і колькасць праблем, якія можна і трэба вырашаць з дапамогай медыятараў. Сямейныя, эканамічныя, працоўныя і міжканфесійныя спрэчкі, крымінальныя справы з удзелам непаўналетніх, праграмы для прымірэння ахвяр і іх пераследнікаў...

Медыятар можа дапамагчы захаваць адносіны не толькі паміж людзьмі, але і прымірыць чалавека з самім сабою, калі яго жыццё ўскладняецца па самой сваёй сутнасці.

— З часам у людзей узнікае ўсё больш цяжкасцяў, і ім прыходзіцца шукаць новыя сродкі для пераадолення праблем. Здараецца, што тыя, хто не справіўся з цяжарам праблем, апынаюцца ў адпаведных лячэбных установах. А калі б іх жыццё было прасцейшае і не патрабавала напружання, яны спакойна існавалі б у сваім асяродку, — упэўнены **Фрэнк ЛЭЙНІ, старшыня Камітэта па ўрэгуляванні спрэчак калегіі адвакатаў штата Паўночная Караліна ЗША.**

### Медыятары ў садках, школах і загсах

Летась медыятары пачалі актыўна працаваць у загсах Мінска, прапануючы дапамогу ва ўрэгуляванні спрэчак. У медыяцыю актыўна ўцягнуты беларускія студэнты і школьнікі. У 2016 годзе праект школьнай медыяцыі распачаўся ў 19 установах адукацыі сталіцы і 12 Гродна. У выніку ў 12 школах запрацавалі школьныя службы медыяцыі. Вучні самі праводзяць медыяцыі, якія датычацца спрэчак у сталовай, сварак паміж найлепшымі сяброўкамі, канфліктаў з выкладчыкамі...

У педагагічным каледжы нават ёсць тэматычны факультатыў. Ужо налета выпускнікі ўстановы, якія маюць веды медыятара, трапяць педагогамі ў сады і пачатковыя школы. Яны генерыруюць ідэі медыяцыі на мульціках і развіваюць іх для самых маленькіх. Па ацэнках дэлегацыі ААН, за два гады ў школьнай медыяцыі ў Беларусі было зроблена больш, чым у іншых краінах. Медыяцыяй зацікавіліся прадстаўнікі камісій па справах непаўналетніх і сацыяльна-педагагічных цэнтраў.

Каб удасканаліць гэтую з'яву ў краіне, Мінюст рыхтуе законапраект аб карэкціроўцы пытанняў медыяцыі ў Кодэксе аб шлюбе і сям'і, Грамадзянскім кодэксе і плануе ўвесці абавязковае накіраванне на працэдуру. Мяркуецца, гэта той выпадак, калі прымус павінен абярнуцца на карысць.

— Каб інстытут медыяцыі дзейнічаў больш эфектыўна і стаў звычкай у прававой культуры грамадства, неабходна карэкціраваць і ўдасканальваць не толькі закон аб медыяцыі, але і працэсуальныя кодэксы, — пераканана **Ала БОДАК, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.** — Карысць медыяцыі ў тым, што яна дазваляе не толькі разгрузіць суды, але, як правіла, і разыходзіцца ўдзельнікам канфлікту як мінімум не ворагамі.

### Міждысцыплінарная прафесія

Мадэль сацыяльна-палітычнага ладу краіны, якая засноўваецца на медыяцыі, сведчыць, што ў грамадстве добра развіты грамадскія інстытуты, лічыць **Ірына ЦЭЛІКАВЕЦ, начальнік упраўлення адвакатуры і ліцэнзавання юрыдычнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Медыяцыя ў Беларусі паспяхова развіваецца ў сферы вырашэння камерцыйных спрэчак, што пацвярджаецца прымірыцельнымі працэдурамі ў сістэме эканамічных судоў. Практыка паказала, што магчымасці медыяцыі ў многіх выпадках перавышаюць магчымасці судавытворчасці, бо яна дапускае прыняцце адрозненняў у пунктах гледжання бакоў. Можна сказаць, што медыяцыя ў краіне склалася як прававы, аднак не як сацыяльны інстытут. Гэтая працэдура, на жаль, знаходзіцца яшчэ на пачатку свайго развіцця і патрабуе карэкціроўкі дзейнага заканадаўства.

Магчымасць дамовіцца праз медыятара дазваляе, акрамя ўсяго, не апавяшчаць аб праблемах, якія маюць абодва бакі ў сваім бізнесе, дадатковых людзей, як гэта было б у судзе. Некаторыя нават пасля застаюцца дзелавымі партнёрамі. Дакументы 10 000 біржавых здзелак штогод змяшчаюць медыяцыйную агаворку.

Айчынная медыяцыя развілася і выйшла з судоў, і ў гэтым яе нацыянальная спецыфіка, пацвярджае і **Ірына БЕЛЬСКАЯ, медыятар цэнтра «Медыяцыя і права».** Судовая медыяцыя пачала развівацца ў краіне яшчэ ў 2008-м, а ў 2010 годзе быў створаны спецыяльны цэнтр для развіцця пазасудовай медыяцыі.

— Сённяшняя медыяцыя вырасла з паняцця працэдуры і стала нечым большым — з яе стварылася дадатковая кампетэнцыя многіх прафесій, — упэўнена яна. — Навукоўцы, псіхолагі, канфліктолагі, выкладчыкі, члены парламента — усе сёння вучаць яе асновы. Тым самым мы выйшлі на міждысцыплінарнасць прафесіі медыятара, якая аб'ядноўвае ўсе адукацыі. Думаецца, калі дзяржава працягне садзейнічаць развіццю медыяцыі, ужо ў 2025-м працэдура стане асноўным сродкам урэгулявання канфліктаў.

### Эліта беларускага грамадства

Медыяцыя павінна прафесійна развівацца ў межах навуковай дысцыпліны. Вучыць медыятараў трэба не некалькі дзён, а два гады, каб гэта былі прафесіяналы. Апроч таго, нельга, каб у медыяцыі дамініравала нейкая прафесія. Пазасудова вырашаць спрэчкі могуць і ўрачы, і настаўнікі, лічыць **Эдрыян РАЙТ, першы сямейны медыятар у Вялікабрытаніі па ўсіх пытаннях:**

— Ва ўсіх людзей ёсць патэнцыял, каб стаць медыятарам. Добра, калі ўдзельнікі працэдуры не здагадаюцца, што іх медыятар мае яшчэ нейкую прафесію. Я ведаю спецыяліста па продажы нерухомасці і медсястру, якія аднойчы адкрылі ў сабе здольнасці медыятараў і цудоўна камунікуюць з людзьмі.

Калі падумаць, амаль кожны з нас хоць аднойчы ды быў у ролі медыятара, калі мірыў родных ці сяброў. Аднак афіцыйна атрымаць такое пасведчанне ў Беларусі можа толькі той, хто ўжо мае вышэйшую адукацыю і адвучыўся ў Цэнтры медыяцыі і перагавораў. За пяць гадоў тут выхавалі 184 спецыялісты. Трэць выпускнікоў — людзі з некалькімі вышэйшымі адукацыямі ці шэрагам дадатковых адукацый. Амаль 80 % — юрысты.

— Можна казаць упэўнена, што прафесіі медыяцыі навучаецца эліта грамадства. Гэта людзі, якія ўжо валодаюць ведамі і жыццёвым вопытам, якія адчуваюць, што саспелі розумам і душою да нечага большага і гатовыя рэалізаваць сябе ў гэтым кірунку, — лічыць **Алена ЖДАНОВІЧ, медыятар Цэнтра медыяцыі і перагавораў.**

У Беларусі сёння працуюць 550 медыятараў. Больш за 60 пасведчанняў выдадзена за паўгода сёлета.

### Па-за межамі шлюбу і краін

Лічыцца, што скасаванне шлюбу — самае страшнае, што можа здарыцца з сям'ёй, бо пасля гэтага яна проста перастае існаваць. Аднак сямейная медыяцыя павінна не абмяжоўвацца толькі разводам, а выходзіць за яго межы. Нельга забывацца на праблемы, якія застаюцца пасля распаду сям'і. Напрыклад, за чый кошт утрымліваць дзіця, бо малое расце і павялічваюцца расходы на яго. Або непаразуменні паміж бацькамі і дзецьмі, якія ўзнікаюць праз змену наладжанага быту, выкліканую разводам, і праз сталенне малых, калі прыходзіць час ужо ім клапаціцца пра бацькоў.

Існуе яшчэ такая з'ява, як міжнародная сямейная медыяцыя. Гэтая працэдура праводзіцца ў дачыненні да сем'яў мігрантаў або тых, што стварыліся пры студэнцкім абмене падчас вучобы. Яна вылучаецца геаграфічным падзяленнем сям'і, калі адна яе частка знаходзіцца ў адной краіне, другая — у іншай.

— Такая медыяцыя праводзіцца ў краіне пражывання бацькі ці маці ў прысутнасці абаіх сужэнцаў і дзіцяці альбо дыстанцыйна праз відэаканферэнцыю, — растлумачыла **Сабіна ЦІТАРЭНКА, асістэнт міжнароднага праекта генеральнага сакратарыята Міжнароднай сацыяльнай службы «Міжнародная сямейная медыяцыя».** — Асаблівасць міжнароднай медыяцыі яшчэ і ў наяўнасці дзвюх юрысдыкцый краін, бо ў кожнай дзяржавы свае, культурныя і нацыянальныя асаблівасці, суверэнітэт, прававыя нормы, мовы. Часам гэта прыводзіць яшчэ да адной асаблівасці — міжнароднага крадзяжу дзяцей, калі адзін з бацькоў утрымлівае малога ў іншай краіне або перавозіць яго без згоды другога.

У многіх краінах не ратыфікавана Гаагская канвенцыя аб крадзяжы дзяцей або яе выкарыстанне здараецца праблематычным. Менавіта ў такіх выпадках медыяцыя можа дапамагчы бацькам дасягнуць пагаднення аб выхаванні дзіцяці. А яшчэ — сэканоміць час, бо і суд: працэдура вяртання, як правіла, цягнуцца доўга. Такім чынам медыяцыя становіцца сцяжынкай ад карнага правасуддзя да аднаўленчага.

**Ірына СІДАРОК.**

# Пячатка і згода не патрэбны

## Дэкрэт № 7 спрасціў работу ў гаражы і жыццё на дачы



На пытанні адказвае **Вольга ВАРАНЕЦКАЯ, кансультант упраўлення прававога рэгулявання бюджэтна-фінансавых адносін і падаткаабкладання Галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы эканомікі і экалогіі Міністэрства юстыцыі Беларусі.**

***— У сваім гаражы з сябрамі хачу арганізаваць майстэрню па рамонту аўтамабіляў. Сам я аўтаслесар, спецыяльна зарэгістраваўся як індывідуальны прадпрымальнік. Але ж адміністрацыя нашага гаражнага кааператыва не дае нам разгарнуцца, — кажа, што патрэбна згода ўсіх членаў кааператыва. Няўжо нічога нельга зрабіць?***

**Аляксандр Вусакоў,** *г. Слонім.*

— Гэта раней, каб наладзіць сваю справу на тэрыторыі кааператыва, патрабавалася згода ўсіх яго членаў. Цяпер жа вам не трэба нічога прадпрымаць дзеля пачатку работы. Вы маеце поўнае права працаваць у сваім гаражы без згоды членаў вашага кааператыва.

А вашай адміністрацыі варта ведаць Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 лістапада 2017 года № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва». Адна з нормаў дэкрэта прадугледжвае, што для ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг па тэхнічным абслугоўванні і рамонце транспартных сродкаў у майстэрнях, якія размешчаны на тэрыторыі гаражных кааператываў, члену гэтага кааператыва, які зарэгістраваны як індывідуальны прадпрымальнік, не трэба атрымліваць на гэта згоду агульнага сходу членаў (сходу ўпаўнаважаных членаў) гаражнага кааператыва.

У любых кааператывах і таварыствах заўжды было вельмі цяжка сабраць агульны сход (сход упаўнаважаных членаў), што ўскладняла атрыманне агульнай згоды сходу. Норма Дэкрэта № 7 значна спрасціла ўмовы для арганізацыі работы на тэрыторыі гаражных кааператываў.

***— У нашым доме адкрылі невялічкі кіёск, дзе прадаюцца аўтазапчасткі. Працуе пункт ажно да 10 гадзін вечара, а адчыняецца а 8-й раніцы. І ўвесь гэты час па двары снуўдаюць нейкія людзі, ездзяць машыны, перашкаджаюць адпачываць. Ці можна працаваць у такі час, і чаму не спыталіся згоды жыхароў, калі адчынялі кіёск?***

**Валянціна Шкныр,** *г. Віцебск.*

— Гаспадар кіёска, калі ён з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, мае поўнае права працаваць у абазначаны вамі час, не шукаючы згоды жыхароў.

Умовы арганізацыі рэжыму працы выкладзены ў абзацы тры падпункта 4.1 пункта 4 Дэкрэта № 7. Тут сказана, што суб'екты гаспадарання пры ажыццяўленні эканамічнай дзейнасці маюць права самастойна ўстанаўліваць рэжым працы аб'ектаў грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання, рознічных гандлёвых аб'ектаў, якія ім належаць. Самастойна таксама можна вызначаць рэжым працы без (па-за межамі) гандлёвых аб'ектаў, рынкаў, аб'ектаў бытавога абслугоўвання і гандлёвых цэнтраў. Час не трэба ўзгадняць з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі і іншымі дзяржаўнымі органамі, калі рэжым працы вытрымліваецца.

Аднак калі такія аб'екты збіраюцца функцыянаваць пасля 23.00 і да 7.00, то ўзгадняць рэжым іх працы з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па месцы знаходжання аб'ектаў неабходна.

Такім чынам, паколькі кіёск у вашым доме працуе ў межах перыяду з 7 гадзін раніцы да 11 ночы, то ўзгадняць рэжым яго працы ўладальніку не трэба.

***— Чула, што цяпер на афіцыйных дакументах у садаводчых таварыствах не трэба ставіць пячатку. Ці так гэта?***

**Маргарыта П., пенсіянерка,** *Дзяржынскі раён.*

— Так, такая норма прадугледжана ў падпункце 3.11 пункта 3 Дэкрэта № 7. Ранейшае патрабаванне аб наяўнасці пячаткі ў садаводчых таварыствах і гаражных кааператывах, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, адменена. Гэта зроблена з мэтай спрасціць дзейнасць суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку таварыстваў і кааператываў.

**Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы.**

■ Год малой радзімы

# На прыём да земляка

**Добрая справа: доктар медыцынскіх навук, прафесар, выдатнік аховы здароўя, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ЦЫРКУНОЎ у час наведвання родных Целяхан бясплатна кансультаваў сваіх землякоў.**

На прыём да прафесара сабралася каля сарака чалавек. Не ўсе іх скаргі ды звароты былі па профілі Уладзіміра Максімавіча як інфекцыяніста і гепатолага, але карысныя парады атрымаў кожны.

Свежы і прафесійны погляд на заключэнні калег, жыццёвы досвед і аптымізм знакамітага земляка многіх прымушалі паглядзець на свае праблемы з іншага боку, атрымаць накіраванне на дадатковае абследаванне, папоўніць свой багаж ведаў па тым ці іншым захворванні.


Фота Валерыя МІСКЕВІЧ.

Цікавілі месцічаў і адкрыцці ў галіне медыцыны, у лячэнні гепатыту.

Слухаць прафесара было вельмі цікава, занепакоенасць хваробамі міжволі саступала месца здзіўленню, як складана «ўстроены» чалавек, як важна для яго паспяховага лячэння ўлічваць розныя абставіны.

І калі б у зале, дзе вялося кансультаванне, былі старшакласнікі, упэўнена, многія з іх захацелі б стаць дактарамі, як Цыркуноў.

**Валянціна БОБРЫК,** *г. Івацэвічы.*



# «А мясціны тут былі прыгожыя...»

**Апошнім часам у інтэрнэце з'явілася шмат відэаролікаў пад агульнай назвай «Гісторыя з геаграфіяй». Яны расказваюць пра беларускія вёскі, якія паміраюць. Балюча думаць пра гэта, балюча глядзець такое «кіно». А тым больш калі там, у гэтым «фільме», родная Рудня.**

Сэрца здрыганулася: няўжо гэта яны, мясціны майго дзяцінства!? Ні лугоў, ні палёў, ні суседніх вёсак. Канава, зарослая хмызам, замест празрыстай рэчачкі Лабжанкі, протока Сожа.

Пільна ўглядалася ў твары людзей — нікога не пазнала. Засталося шэсць двароў, якія стаяць паасобку ў розных канцах былой прыгажуні-вёскі. Дзякуй Богу і людзям, што лес пасадзілі: сосны ўсё ж лепей, чым бур'ян-трава.

А мясціны тут былі прыгожыя: вясною — у бела-ружовым вэлюме садоў, у водарах чаромхі і бэзу, летам — у кветкавых дыванах і пчаліным гуле, што толькі ўначы заціхаў над векавымі ліпамі. А ягады-грыбы, якія можна было касіць касою, а стаўкі і азёры, што літаральна кішэлі рыбай...

А галоўнае — людзі, дружныя, працавітыя. Іх клопатам падрасталі дзеці, каласілася збажына і радзіла бульба. Шчодрая зямля: нездарма ж яе аблюбавалі далёкія продкі. У 1994 годзе студэнты Магілёўскага педуніверсітэта праводзілі тут раскопкі. На месцы вёскі была знойдзена стаянка старажытных людзей. Так што радзімічы ведалі, дзе сяліцца...

Аб гэтым — асабліва цяпер, калі падводзіць здароўе — думаю ўсё часцей і часцей: вяртаюся сэрцам у родны куточак. Як жа там добра было, як прыгожа! Некалі ў Клімавіцкі раён мы з аднакурснікамі прыехалі на бульбу. І я пешшу павяла сяброў «у родную Рудню». Яны потым казалі, што нарадзіўшыся сярод такой прыгажосці, немагчыма не пісаць вершаў. І я пісала. І пішу.

Даўно няма бацькоў. Няма і хаты. Хіба што здымак печы, на якой выраслі пяцёра дзяцей:

*...З вайны вярнуліся, адбудаваліся,*
*Палі засеялі. Цвілі сады.*
*Мы з песняй матчынай тут гадаваліся.*
*Чаму ж не ў радасці сягоння ты?*
*Хаціны рэдкія, непазнавальныя.*
*Знаёмай вуліцы нібы няма.*
*Сасёнкі гонкія заместа яблыняў,*
*А па-над соснамі — густы туман.*

Год Малой Радзімы. З вялікай літары ўсе тры словы я пішу невыпадкова: так адчувае сэрца.

**Наталля СІВАК (ЗОЛЬНІКАВА),**
*в. Заполле, Чэрвеньскі раён*

■ Так ці не? Практыкум

# УВЕРХ ПА ЛЕСВІЦЫ? ЦІ ПА ДРАБІНЕ?

**Сёння ў нашай пошце пытанні пра розніцу паміж словамі «станоўчы» і «дадатны», паміж лесвіцай і драбінай, а таксама пра значэнні слова «ўлюбёны».**

***Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.***

1. У беларускай мове ёсць два прыметнікі, якія могуць ужывацца ў аднолькавых значэннях: **станоўчы** і **дадатны**. Напрыклад, можна сказаць, што нейчая дзейнасць мела станоўчыя або дадатныя вынікі.

Аднак у некаторых значэннях гэтыя словы не ўзаемазамяняльныя. Прыметнік *станоўчы* не ўжываецца ў значэннях, звязаных з матэматыкай і фізікай. Таму трэба гаварыць і пісаць *дадатны лік, дадатны зарад* і г. д. Дадатны ж, у сваю чаргу, звычайна не ўжываецца ў значэнні 'які характарызуецца дадатнымі якасцямі', таму скажам, што *гэта станоўчы персанаж твора*, што *ён увогуле быў чалавек станоўчы*.

2. Сходы, або сходкі (як і ў апісаным вышэй выпадку, мы гаворым пра словы, якія называюць падобныя паняцці, таму часам іх можна зблытаць) абазначаюць лесвіцу ўнутры памяшкання або тую, што з яго выводзіць. Прытым такая лесвіца — частка самога будынка. Сходы могуць мець або не мець поручні.

*Амаль з сярэдзіны прыхожай шырокія беламармуровыя сходы вялі на другі паверх, падзяляліся надвае і прыгожа, закруглена ўзбягалі амаль у такі самы па памерах другі пакой* (У. Караткевіч).

Драбінамі (драбінай), або лескамі, традыцыйна называлі драўляную пристаўную лесвіцу. Цяпер яны бываюць не толькі з дрэва, іх робяць з розных матэрыялаў. Для зручнасці яны могуць «высоўвацца», складвацца і раскладвацца. І пры гэтым заставацца лескамі, лесвіцай, драбінамі.

*І вось адзін раз, настаўнік Калабуха ўбіваў цвік у самы купал сінагогі. Прыладзіў драбіны і пачаў моцна бухаць па цвіку...* (А. Мрый).

3. Значэнне слова **ўлюбёны**, у якім яно сёння актыўна ўжываецца, — 'любімы': *мой улюбёны фільм, татава ўлюбёная дачушка, Андрэева ўлюбёная кніжка.* Тым не менш выкарыстоўваецца гэтае слова і яшчэ ў адным патрэбным значэнні: 'ачараваны', 'захоплены'. Калі хочам адзначыць, што нехта на сваім месцы ў прафесіі, скажам, што ён улюбёны ў сваю справу. Ці вось яшчэ прыклад ужывання:

*Застануцца сябры, улюбёныя ў літаратуру, і сярод іх — яго духоўны вучань Вінцэсь Каратынскі* (А. Мальдзіс).

## У АБАРОНУ СЛОЎ

Ёсць у нас цудоўныя словы — **загойваць, загойвацца**. Яны шырока ўжываюцца, і з дапамогай іх мы апісваем, як наша цела і наша душа змагаюцца з прыкметнымі і нябачнымі ранамі. Адсюль і эпітэт *незагойная* (рана), і выраз *загойваць (залечваць) раны*.

Ёсць у нашай вялікай моўнай скарбонцы і слова **зажываць**.

Развесці значэнні гэтых сінонімаў цяжка, яны блізказначныя. Можна хіба сцвердзіць, што са словам *рана* многія крыніцы звязваюць хутчэй дзеясловы *загаць, загаіцца*

■ Чалавек — чалавеку

# ГРЫБНЫ АВАНТУРЫЗМ,

## або Спантаннае падарожжа па родным краі

**Ліпень адплакаў, прычым шчодрымі дажджамі. Ці не час наведацца ў лес, у грыбы? Памятаючы паведамленні пра няўдачлівых грыбнікоў, праверыў зарадку мабільніка, напоўніў бутэльку вадой з малінавым варэннем. У заплечнік — посуд для грыбоў, туды ж ножык...**

**Матацыкл, дзякуй богу, не падводзіць, чатырнаццаты сезон. Еду на ім да галоўнай дарогі і думаю, што налева — блізка (два-тры кіламетры і ты ў сваім лесе), а вось направа — гадоў, можа, з дваццаць не ездзіў.**

**Не іначай авантурызм гоніць у некалі вядомую грыбную мясціну: спыняюся, «даследую», вяртаюся з... дзвюма жоўтымі «сястрычкамі».**

За мостам цераз Дрысу вітаю прагаліну маладзейшага лесу на месцы атокінскага кургана, які мы ў школьныя гады даследавалі пад кіраўніцтвам (светлай памяці) Георгія Васілевіча Штыхава. Там жа прастую міма каменя з надпісам «Беражыце лес», паўз які за дзень праязджаюць мо тысячы людзей і не «бачаць», то-бок — не берагуць: месцамі — бязладная высечка, месцамі — параскіданыя пакеты, бутэлькі — нават з-пад шампанскага.

А дарога між тым працуе, шуміць, кліча далей: кірую ў бок вядомай станцыі Дрэтунь, дзе такія баравіны, такія імшары журавін, такія чарнічнікі... Нездарма людзі едуць туды з Расонаў і Полацка, часам — за дзясяткі кіламетраў. Да таго ж лясныя дарогі там пралягаюць, як правіла, па пясчанай мясцовасці: яны прыдатныя для легкавушак, а яшчэ больш — для матацыкла. Адзінае — не дужа разгонішся: страшнавата «злавіць» сустрэчную...

Да таго ж на ўзбочынах часта сустракаюцца навешаныя на дрэвы пакеты, пластыкавыя бутэлькі — арыенціры для «наступнікаў», вядомыя толькі ім.

На адным з чарговых прыпынкаў у пошуку лісічак (менавіта па іх я збіраўся ў лес) натрапіў на косці і «коўдру» з ласінай шэрсці. З якой прычыны загінуў той горды прыгажун, невядома. І рагоў, на жаль, не пакінуў.

Я між тым ехаў далей, ужо... не ведаючы, дзе канкрэтна знаходжуся і... не шкадуючы, бо была ў тым і нейкая рамантыка, чараўніцтва ды перакананне, што назад дарогі няма!

Раптам уверсе мільганулі правады, потым — трансфарматар і пабудова, на якой чорным па шэраму было напісана: «НП Сургут — Полоцк 3197 км».

Гэта падымала настрой. Падумаў: грыбоў не назбіраю, дык хоць павандрую ад душы. Спыніўся ў прыцішаным лесе, паслухаў птушак, міжволі падумаў, які ўсё ж кароткі год!.. Натрапіў на лапік чарніц. Яны такія салодкія! І чарнічнікі чыстыя, без зарасніказ багуну.

А далей між маладзенькіх соснаў мільганула азярцо. Рыбакі сказалі, Звярынае. Берагі ў яго высокія, абрывістыя. У суседняга возера Страдань — якраз наадварот: да берага не падысці — балота, зыбучы мох, затым вада і неабсяжны прастор...

У лесе шчэрацца вялізныя копанкі-сховішчы для танкаў, зарослыя мохам. Пра экалогію тады, напэўна, не думалі, зладзілі вялікае ваеннае вучэнне. Танкі ўціснулі ў грунт і частку брукаванкі Дрэтунь — Празарокі. Цяпер яна звузела да амаль што ляснай дарогі...

Вось па ёй я і кірую дахаты — амаль без грыбоў (толькі пакаштаваць), але з асалодай ад уражанняў, вартых таго, каб аддаць ім адзін дзень жыцця. Шкада толькі, што фотаапарат не ўзяў. Прыйдзецца яшчэ раз паехаць направа.

А налева, трохі адпачыўшы, мы з'ездзілі з жонкай. Хутка, хвілін за сорак, набралі столькі ж грыбоў, колькі я за цэлы дзень.

**Аляксандр МАТОШКА,**
*в. Янкавічы, Расонскі раён*

■ (Не)тыповыя беларусы

Наш герой — пра складаныя эмоцыі, залежнасць як спосаб уцячы ад жыцця і свае пункты апоры

# «ПЕРАЛОМ ПАЗВАНОЧНІКА? КАЛІ? Я І НЕ ЗАЎВАЖЫЎ...»

**Неяк я праглядала ў інтэрнэце каталог фітнес-клубаў, выбіраючы, куды б запісацца, і выпадкова натрапіла на два здымкі аднаго і таго ж інструктара. І тут жа з'явілася адчуванне, што на мяне глядзяць два розныя чалавекі. На адным у вачах мужчыны была энергія і нейкая неймаверная зухаватасць, пра такіх у народзе кажуць «шкура гарыць». На другім — зусім іншы выраз вачэй, і неяк было зразумела, што гэта не імгненнае змяненне позірку. І што чалавек, магчыма, перажыў нейкую сур'ёзную ўнутраную трансфармацыю...**
**Перад вамі — гісторыя 42-гадовага Яўгена СЕМЯРЫХІНА з Мінска, які прайшоў шлях ад алкаголіка да... Зрэшты, да каго — пісаць не будзем, таму што жыццё — не статычнае, шлях не завершаны, а цяперашні статус нашага героя чытачы могуць вызначыць і самі.**



## «Мазгоў у мяне ў юнацтве не было...»

— Мяне выхоўвалі маці і айчым, — успамінае Яўген. — Родны бацька выпіваў, я з ім мала кантактаваў, па-сапраўднаму і не ведаў... Калі я скончыў школу, у галаве быў вецер. Памятаю, што хацелася з'ехаць у вёску. Я ездзіў туды кожныя канікулы да бабулі, і мне там падабалася. У вёсцы я адчуваў сябе жывым, сапраўдным. Там былі рэчка, лес, мапед, свабода, сябры — сапраўднае жыццё... У нас з сябрамі было шмат сваіх падлеткавых інтарэсаў. Мы майстравалі выбуховыя прылады і падрывалі іх, вядома. Майму сябру нават вока траўміравала...

Пасля школы Яўген аднёс дакументы ў найбліжэйшае да дома вучылішча, але неўзабаве зразумеў, што будоўля — гэта не яго. «Там выпівалі, маглі сцягнуць тое, што дрэнна ляжыць, — кажа ён. — А я тады яшчэ не быў знаёмы з алкаголем. І мне ўсё гэта было незразумела і непрыемна».

Потым хлопец паступіў у педуніверсітэт і стаў вывучаць дашкольную педагогіку, псіхалогію і фізічную культуру. І так атрымалася, што ў гэтыя ж гады пазнаёміўся з алкаголем, прычым даволі шчыльна. Не раз трапляў у міліцыю ў п'яным выглядзе, у асноўным за хуліганства.

«Мяне не цягнула нешта разбураць, хутчэй, была цяга да самаразбурэння. Я залазіў п'яным на нейкія высокія паверхі, напрыклад, у інтэрнат да дзяўчат па балконах... Было шмат і іншых «подзвігаў». Маці вельмі перажывала, вядома. І нават спрабавала не пусціць мяне неяк у адну паездку, але я яе не паслухаў, адштурхнуў — і трапіў у той дзень у жудасную аварыю... Мы п'яныя ўсе былі, я і мой таварыш, і той, што за рулём, таксама. У выніку на Брэсцкай трасе выехалі на сустрэчную паласу — і трапілі ў лабавое сутыкненне. Мой таварыш загінуў адразу ж. А я апрытомнеў у бальніцы, увесь у бінтах, але на наступны ж дзень збег адтуль, абапёршыся на сябра, які прыйшоў праведаць мяне. Увогуле, мазгоў у мяне ў юнацтве не было... Дарэчы, мой таварыш, які быў тады за рулём, праз два тыдні павесіўся. Сумленне замучыла, бо ў гэтай аварыі загінуў наш сябар, які сядзеў побач з ім. А я — я працягнуў піць...»

Завязаў з алкаголем наш герой недзе 12 гадоў таму. «У мяне тады шмат усякіх гісторый было, — кажа ён. — У алкаголікаў заўсёды шмат гісторый, і ў асноўным самаразбуральных, звязаных з рызыкай для жыцця. Я быццам шукаў, дзе забіцца... Памятаю, калі я ўжо перастаў піць і ў мяне вельмі балела спіна, я прыйшоў у паліклініку зрабіць рэнтген, а мне кажуць: вядома ж, будзе балець, у вас жа там перalом быў. Кампрэсійны пералом, вось, два пазванкі сплясканыя... А я думаю: што? калі? Я ж і не заўважыў»...

Цяпер Яўген не кантактуе з ранейшымі сваімі сябрамі, якія працягваюць піць. Кажа, што шмат каго з іх ужо і ў жывых няма.

«Мой найлепшы сябар памёр у турме — яго пасадзілі з-за наркотыкаў. З другім таварышам адбыўся няшчасны выпадак, трэці трапіў у аварыю... Увогуле, шмат хто не дажыў да майго сённяшняга ўзросту. А хто дажыў — часам бачу іх і разумею, што гаварыць мне з імі даўно ўжо няма пра што. І вельмі сумна ад таго, што нічым не магу ім дапамагчы. У іх ужо пройдзены пункт невяртання, яны не хочуць нешта мяняць у сваім жыцці».



## «Скажы мне хто, што апынуся ў будысцкім манастыры, — я б доўга смяяўся»...

Яўген спрабуе ўспомніць, калі менавіта перастаў піць. І расказвае, што неяк патэлефанаваў яго таварыш і запрасіў працаваць масажыстам у Палац воднага спорту. Ва ўніверсітэце яны вывучалі класічны масаж, і наш герой нават залік па ім здаваў, але не думаў, што яму гэта калі-небудзь спатрэбіцца. У той дзень ён пайшоў уладкоўвацца на працу без асаблівай веры ў тое, што яго возьмуць — але яго ўзялі.

«Я стаў працаваць — і тут раптам у мяне прачнуліся мае школьныя захапленні, напрыклад, цікавасць да ёгі. Я нават стаў ездзіць на семінары ў Маскву. Потым пайшоў вучыцца тайскаму масажу... Дзякуючы ёзе я цяпер практычна не заўважаю праблем са спінай. І сышло нейкае ўнутранае напружанне, ну, ці стала нашмат менш. Я стаў спакайнейшы, раўнейшы. А на курсах тайскага масажу пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай...»

«Праз нейкі час мы з ёй разам паехалі ў Тайланд — не адпачываць, а далей вучыцца масажу, — успамінае Яўген. — А потым паехалі яшчэ раз — пажыць два тыдні ў будысцкім манастыры, і гэта аказалася самым яркім маім успамінам пра Тайланд. І ў нейкім сэнсе — самым прыемным. Там ува мне адбыўся пераварот. Спачатку я супраціўляўся манастырскаму рэжыму, нават не выходзіў некалькі дзён са сваёй келлі. Вось быццам бы сам туды паехаў, і ў той жа час парушаў правілы, быццам нейкае ўнутранае супраціўленне было. Тады настаяцель манастыра выклікаў мяне і сказаў нешта ў тым духу, што тут, маўляў, не санаторый: альбо падпарадкоўвайся манастырскаму статуту, альбо — да пабачэння. Маім першым парывам было з'ехаць. Але ён дадаў: ты хоць паспрабуй, перш чым сысці... І я раптам адчуў нейкую сілу ў яго словах і вырашыў-такі паспрабаваць: узяў зарок маўчання, пачаў хадзіць на ўсе медытацыі... Потым, ад'язджаючы, мы так кранальна развіталіся з гэтым настаяцелем, ледзь не са слязамі на вачах! Ён ціснуў мне рукі і ўсё казаў: гуд мэн, гуд мэн...

І, ведаеце, у мяне ўнутры нешта моцна памянялася за тыя два тыдні. Памятаю, як не мог заснуць у першыя два-тры дні, усё круціўся на тоненькім матрасіку на падлозе — было вельмі цвёрда, усё цела балела. А ў пачатку другога тыдня я раптам злавіў сябе на адчуванні: як тут выдатна!.. І вельмі не хацелася з'язджаць адтуль. Пасля заходзіў ва ўсе храмы, што сустракаліся на маім шляху — а іх у Тайландзе тысячы! — і фатаграфаваў, фатаграфаваў... Так мяне ўсё гэта ўразіла! А калісьці, скажы мне хто, што я апынуся ў будысцкім манастыры і мне там спадабаецца — я б доўга смяяўся, напэўна».

## «Без унутранай працы над сабой ты проста будзеш «сухім алкаголікам»...

Але больш за ўсё, як лічыць сам Яўген, на яго паўплывалі ўсё ж такі заняткі па джыу-джыцу. «Гэта японская барацьба, я займаюся ёю яшчэ ў юнацтве і не кідаў заняткі, нават нягледзячы на п'янкі, — кажа ён. — Мне вельмі падабаліся трэніроўкі, яны праходзілі быццам на адным дыханні, і я не чуў ні стомы, ні болю... Гэта быў мой спосаб справіцца са сваімі складанымі эмоцыямі, як цяпер разумею. Са сваёй агрэсіяй... Памятаю, як у мяне мяняліся чаканні. Калі спачатку было цікава, як з дапамогай джыу-джыцу можна ўздзейнічаць на іншых людзей, то потым стала цікава, што джыу-джыцу робіць са мной. Я думаю, у працэсе трэніровак у мяне сфарміраваўся нейкі валявы стрыжань, які нават алкаголь не змог растварыць».

Цяпер ён сам вядзе групу па джыу-джыцу. А яшчэ вучыцца на псіхолага. «Мне гэта вельмі цікава, і далей — усё цікавей і цікавей, — тлумачыць Яўген. — І, на мой погляд, у мяне змянілася ў лепшы бок якасць жыцця і якасць адносін. Зараз я ўжо разумею, што для таго каб кінуць піць, недастаткова проста кінуць піць. Фізічная адмова ад гарэлкі — гэта толькі першы крок. Далей павінна быць псіхатэрапія. Гэта зразумеў зусім нядаўна. Я нейкую колькасць гадоў жыў проста без гарэлкі, а цяпер пайшоў разбірацца далей у сваім жыцці. Таму што без унутранай працы над сабой ты проста будзеш «сухім алкаголікам». Твая залежнасць застанецца, проста яна можа перакінуцца на іншыя аб'екты. А псіхатэрапія дае магчымасць заўважыць свае звыклыя шаблонныя рэакцыі. Але тут патрэбны іншы чалавек, адмыслова навучаны, натрэніраваны, які дапаможа табе ўсё гэта заўважыць. І дапаможа навучыцца спраўляцца, перажываць свае складаныя эмоцыі, не звяртаючыся да нейкай анестэзіі. Анестэзіяй можа быць што заўгодна — алкаголь, цыгарэты, інтэрнэт... Гэта ўсё спосабы ўцякаць ад жыцця, ад сваіх цяжкасцяў і сапраўдных моцных эмоцый. Але ўцячы ад іх немагчыма. А калі іх спрабаваць ігнараваць, яны могуць прарасці ў нейкі сімптом: у дэпрэсію, бяссонніцу альбо ў нейкае псіхасаматычнае захворванне, ажно да самага цяжкага...»

«Я разумею, што былых алкаголікаў не бывае. І што мне цяпер нельга піць наогул, інакш усё вернецца. На маіх вачах адзін сябар вырашыў, што ён ужо здаровы і цяпер зможа сябе кантраляваць (гэта, дарэчы, мара любога алкаголіка і наркамана — ужываць толькі па святах. Але так не бывае — патрэбна поўная адмова). І ён выпіў крыху віна. Потым вырашыў, што можа выкурыць адну — усяго адну! — цыгарэтку. Скончылася тым, што ён у той вечар напіўся і накурыўся — а перад гэтым больш за пяць гадоў не піў і не курыў. Увогуле, зноў вярнуўся да «сябе ранейшага». Гэта ўсё адбывалася на маіх вачах, і я пераканаўся, як хутка і магутна вяртаецца залежнасць. Таму, калі ў чалавека ўжо паламаны механізм самакантролю — патрэбна поўная адмова. Інакш усё роўна вернешся да запою»...

**P.S. Вось такая гісторыя аб выхадзе з цяжкай алкагольнай залежнасці. І пра пункты апоры, якія дапамагаюць у гэтым. У розных людзей яны могуць быць розныя. Наш герой падзяліўся сваімі. У яго цяпер усё добра: ёсць любімая жонка, маленькая дачка, ён знайшоў сваё прызванне і шлях, верны яму. ...У нейкі момант я злавіла сябе на думцы, што ў яго былі ўсе шанцы ператварыцца ў чалавека, з якім мне наогул не захацелася б размаўляць. І не толькі мне. Але замест гэтага ён стаў тым, з кім шукаюць сустрэчы. З кім цікава, хто можа матываваць... Таму што яго гісторыя сведчыць пра тое, што з якога заўгодна нізкага стартавага пункта можна рвануць уверх — і гэта дае надзею.**

**Святлана БУСЬКО**

# АХВОТА ДА МАРАК

## Ці ёсць будучыня ў айчыннай філатэліі?

**Першая паштовая марка з'явілася ў 1840 годзе. І практычна адразу ж з'явіліся людзі, якія пачалі іх калекцыянаваць. З цягам часу іх інтарэсы распаўсюдзіліся на канверты, наклейкі, адбіткі штэмпеляў... Філатэлія была вельмі папулярная за савецкім часам. Але наколькі захоўваецца да яе цікавасць сёння? Аб гэтым мы распыталі старшыню прэзідыума праўлення грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз філатэлістаў» Сяргея ПІЛІПОВІЧА.**







***— Ці можна назваць філатэлію навукай?***

— Такі падыход заўжды існуе. Справа ў тым, што маркі, канверты, паштоўкі, якія калекцыянуюць філатэлісты, адначасова з'яўляюцца і дакументамі гісторыі. Паштовы штэмпель на марцы, канверце дае прывязку па часе, дакументуючы ліст або тэлеграму. І для таго, каб правільна ідэнтыфікаваць пэўнае паштовае адпраўленне, часам даводзіцца праводзіць шмат часу ў бібліятэках, архіве. Не ўсе ж акалічнасці гісторыі дагэтуль шырока вядомыя.

Напрыклад, пры складанні калекцыі па гісторыі пошты Беларусі 1914—1920 гадоў часам вельмі складана вызначыць, кім, калі і з якой мясцовасці быў дасланы ліст. Штэмпель і дата стаяць. А хто менавіта там быў у гэты час — царскія войскі, савецкія, польскія, нямецкія — вялікае пытанне. Тыя ж палякі і немцы зрэдку вазілі з сабой свае штэмпелі, але часцей за ўсё яны проста прыходзілі на пошту і карысталіся той гаспадаркай, якая там заставалася. Іх змянялі новыя гаспадары, і працэс ішоў па крузе.




Ці вось узяць тэматычную філатэлію. Для таго, каб правільна класіфікаваць птушак, звяроў, трэба таксама пагрузіцца ў літаратуру і даследаванні. І па вялікім рахунку гэта мяжуе з навукай.

***— Наколькі ў нас распаўсюджаны выданні па філатэліі?***

— Спецыялізаваных часопісаў у нашай краіне няма. Не ў апошнюю чаргу з-за таго, што колькасць філатэлістаў у таварыстве невялікая. Зараз па ўсёй Беларусі ў нашых шэрагах прыкладна 200—250 чалавек. Хоць «Веснік сувязі» вядзе старонку, дзе намеснік старшыні Леў Коласаў перыядычна публікуе артыкулы на працягу шэрагу гадоў. І гэта можна лічыць беларускім выданнем па філатэліі. У Расіі ёсць штомесячны навукова-папулярны часопіс «Філатэлія», які з'яўляецца нашчадкам выдання «Філатэлія СССР». Пачынаючы з 1966 года, калі было створана таварыства, часопіс выходзіць стабільна. Часопіс «Калекцыянер» выходзіць раз на год. Ён больш спецыялізаваны, там друкуюцца сур'ёзныя даследчыцкія артыкулы. Але там, акрамя філатэліі, разглядаецца яшчэ і нумізматыка. Ва Украіне быў цікавы, добра ілюстраваны часопіс «Рус», прысвечаны расійскай і ўкраінскай філатэліі. Выйшла недзе нумароў адзінаццаць, але некалькі гадоў таму выпуск быў часова прыпынены. Таксама існуе шэраг каталогаў на розныя тэмы — савецкіх марак, сучасных расійскіх. Ёсць і каталог марак Беларусі, якія пачалі выпускацца ў нас з 1992 года, і яны таксама з'яўляюцца аб'ектамі калекцыянавання. Літаратуры шмат, і яна зараз больш даступная, чым калі я пачынаў — паўстагоддзя таму.

***— Што вас натхніла на тое, каб заняцца філатэліяй?***

— Бацька быў у камандзіроўцы ў ЗША і прывёз адтуль некалькі пакетаў з маркамі. У нас у школе многія збіралі маркі, мы мяняліся імі, гулялі... У мяне была мэта сабраць маркі ўсіх краін свету. У гэтым дапамагалі клубы філатэлістаў, куды я пачаў хадзіць у 1970-я гады. У Мінск тады прыязджалі па 500—1000 чалавек з усяго Саюза. На ўсіх былі альбомы — і можаце сабе ўявіць, які быў выбар. І колькасць калекцыянераў была ў разы вышэйшая, чым цяпер. Збіранне марак з усіх краін свету вельмі дапамагло ў школе. Я мог з закрытымі вачыма паказаць на карце свету любую дзяржаву, ведаў усе сталіцы. І быў стымул шукаць маркі далей, каб закрыць «белыя плямы». Канешне, паколькі краін вельмі шмат, а тады былі яшчэ і калоніі ў Афрыцы і на Ціхім акіяне, то калекцыю ўдалося сабраць вялікую. Затым пачаў збіраць маркі СССР, пасля — Беларусі. Зацікавіўся і лістамі, і адбіткамі штэмпеляў, і канвертамі.




***— Што ўплывае на рэдкасць маркі?***

— Напрыклад, паліграфічны брак. У ідэале ён не мусіць выходзіць за сцены друкарні, паколькі ў ёй прысутнічае чалавек, які робіць выбракоўку тыражу. Але зноў жа, слабасты чалавечы фактар: замылілася вока, кантралёр дзесьці недагледзеў — і такая марка з дэфектам выходзіць у вялікі свет.

Існуе шэраг вядомых у свеце марак, якія напачатку нават прайшлі незаўважанымі калекцыянерамі. Напрыклад, марка Брытанскай Гвіяны — былой калоніі Вялікабрытаніі ў Паўднёвай Амерыцы. У яе вельмі цікавая гісторыя. Яна была выпушчана ў свет ажно ў 1856 годзе. У Гвіяну тады павінны былі прыйсці маркі марскім шляхам з метраполіі, але чамусьці карабель своечасова так і не даплыў. Таму мясцовая друкарня пачала друкаваць саматужныя маркі. Мясцовы паштмайстар даў загад, як павінна выглядаць марка, але ў друкарні вырашылі дадаць выяву парусніка. Такая «самадзейнасць» паштмайстру не спадабалася, і ён даў загад усю карэспандэнцыю з наклеенымі маркамі падпісваць ад рукі.

Праз некалькі гадоў марку з аўтографам знайшоў 12-гадовы школьнік сярод лістоў свайго дзядзькі. Зазірнуў у каталог — а там яе няма. І вырашыў прадаць знаёмаму калекцыянеру за суму, якая ў пераліку на цяперашнія грошы не перавышае трох долараў ЗША. Ведаў бы ён, што цяпер яе кошт перавысіў ужо дзевяць з паловай мільёнаў долараў! А прычына простая — «нефарматная» марка вядомая ўсяго ў адным экзэмпляры.

Ці вось калі прыгадаць так званую «Лімонку». Так філатэлісты празвалі марку лімонна-жоўтага колеру, якая была выпушчана ў СССР у 1925 годзе. На ёй адлюстраваны селянін і пазначаны намінал — 15 капеек золатам. Асаблівасць яе ў тым, што калі друкаваўся выпуск, зламаўся перфарацыйны станок. Кіраўніцтва Дзяржзнака вырашыла не перарабляць тыраж, паколькі ён быў вельмі малы і да таго ж прызначаўся для адправак ў аддаленыя мясцовасці СССР. А калі калекцыянеры спахапіліся, што гэта марка крыху адрозніваецца ад астатніх, то практычна ўвесь тыраж быў выкарыстаны па прызначэнні. Таму цяпер непагашаная «Лімонка» лічыцца вельмі рэдкай маркай.

Нядаўна была знаходка — адна з марак серыі «Курорт» 1949 года. Раптам высветлілася, што яна была надрукавана з іншым растрам — структурай выявы. І пакуль вядома толькі некалькі марак гэтай серыі.

***— Ці сустракаюцца маркі з перавёрнутымі выявамі ці надпісамі?***

— Хутчэй, гэта датычыцца наддрукоўак. Напрыклад, мяняецца паштовы тарыф. А вялікі тыраж са старым наміналам застаецца нерэалізаваным. У такім выпадку пераразрочвалі паштовую марку і наносілі наддрукоўку. Практычна ўсе наддрукоўкі па каталозе сустракаюцца ў перавёрнутым выглядзе ці на іншым баку маркі. А яшчэ выкарыстоўваецца часам фарба, якая прайшла праз паперу наскрозь.

***— Ці можна назваць філатэлію дынастычнай справай?***




— Ідэальны выпадак, калі калекцыя пераходзіць ад бацькі да сына і далей. Але, як паказвае практыка, у нас гэта з'ява нячастая. Лягчэй перадаць досвед блізкаму чалавеку, чым прыцягваць кагосьці іншага. Таму дзяцей трэба прывучаць з маленства. Напрыклад, маладыя людзі з 12 да 22 гадоў у філатэлістаў падзелены на тры ўзроставыя групы. Іх калекцыі заўжды экспануюцца на выстаўках. Колькасць іх на міжнародных выстаўках — у Фінляндыі, Вялікабрытаніі, Польшчы — даходзіла да некалькіх дзясяткаў. І нашы маладыя калекцыянеры атрымлівалі нават медалі. Таму будучыня ў нашай філатэліі ёсць. Наша задача — падтрымліваць гэтыя імкненні. Калі не мы, то хто?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

### У гонар пажарных

20 ліпеня Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі ў абарачэнне была выпушчана паштовая марка «Беларуская пажарная служба». Яна аддрукавана тыражом у 63 тысячы экзэмпляраў. Графічнае аздабленне маркі — эмблема Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і пажарная каска. Дызайн распрацавала Тацццяна Кузняцова. Нагадаем, што ў мінулую сераду беларускія ратавальнікі адзначылі 165-я ўгодкі з дня заснавання пажарнай службы ў Мінску.

### «Буквар» цяпер і на марцы

На мінулым тыдні споўнілася 400 гадоў, як у друкарні горада Еўе (сучасны літоўскі Вевіс) свет убачыў «Букварь языка славенска». Буквар стаў першым у свеце выданнем такога кшталту. Але ў свеце захавалася толькі два экзэмпляры гэтай кнігі. Прычым поўны — толькі адзін, і знаходзіцца ён цяпер у Вялікабрытаніі. Да гэтай даты ў свет выпушчана адпаведная марка тыражом 48 тысяч з выявай першай старонкі «Буквара». Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

## Проведение третьих повторных торгов по продаже имущества НП ОДО «Фундаменты»

| № лота | Наименование лота | Начальная цена, руб. (без НДС) | Сумма задатка, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль грузовой (бетоносмеситель) «МАЗ 5337А2» ABS-5-01, Y3M5337A280000934, 2008 г. в. | 3 990,00 | 399,00 | 199,50 |

Цена указана без НДС. (УСН)

Торги в электронной форме (далее – торги) будут проведены на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY:

начало – 23 августа 2018 г., в 09.00, окончание – 23 августа 2018 г., в 17.00.

**Письменная заявка на участие в торгах и копия документа, свидетельствующего об оплате задатка, подается по 21.08.2018 на адрес электронной почты организатора торгов: torgi24@tut.by.**

Задаток на участие по каждому лоту составляет 10 % от его начальной цены и должен быть перечислен по **21.08.2018** на расчетный счет организатора торгов – ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Корженевского, 14, оф. 404, УНП 191514793, р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код (BIC) UNBSBY2X, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в электронных торгах **23.08.2018.**

Организатор торгов: **ООО «Расантехторг»,** тел. +375(29)670-30-84.

Продавец: **НП ОДО «Фундаменты»,** в лице управляющего ООО «БизнесУэй», тел. +375 (29) 165-33-65.

Местонахождение лота: **Логойский р-н, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 38.**

Лицо, ответственное за хранение имущества: **ООО «Расантехторг»,** тел. +375 (29) 670-30-84.

Ознакомиться с лотами можно в будние дни с 09:00 до 17:00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия.

Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в электронных торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by и на сайте **WWW.TORGI24.BY.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Пуховичского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

**Лот № 1: магазин (со складом), общ. пл. 78,4 кв. м,** инв. № 602/С-13794, на земельном участке пл. **0,0245 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, Туринский с/с, д. Уголец.** На земельном участке имеются ограничения прав в использовании – водоохранная зона р. Волма.

Начальная цена с НДС (20 %) – **4 140,00 бел. руб. (задаток – 414,00 бел. руб.);**

**Лот № 2: магазин, общ. пл. 163,7 кв. м,** инв. № 602/С-48295, на земельном участке пл. **0,0870 га** (предоставлен на праве аренды) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, Дубровский с/с, д. Клетное, 9А.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 7 510,00 бел. руб. (задаток – 751,00 бел. руб.);**

**Лот № 3: магазин, общ. пл. 63,7 кв. м,** инв. № 602/С-50877, на земельном участке пл. **0,0240 га** (предоставлен на праве аренды) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, Туринский с/с, д. Подбережье, 1В.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 3 060,00 бел. руб. (задаток – 306,00 бел. руб.);**

**Лот № 4: заготовительный пункт (с пристройкой), общ. пл. 65,3 кв. м,** инв. № 602/С-50848, на земельном участке пл. **0,0666 га** (предоставлен на праве аренды) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, Шацкий с/с, д. Поречье, ул. Дорожная, 30/1.** На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: водоохранная зона р. Птичь (0,0666 га.), охранная зона ЛЭП (0,0409 га).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 1 130,00 бел. руб. (задаток – 113,00 бел. руб.);**

**Лот № 5: магазин, общ. пл. 352,9 кв. м,** инв. № 602/С-45186, на земельном участке **пл. 0,1223 га** (предоставлен на праве аренды) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, Шацкий с/с, д. Поречье, ул. Дорожная, 30.** На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: водоохранная зона р. Птичь (0,1223 га.), охранная зона ЛЭП (0,0189 га.).

Начальная цена с НДС (20 %) – **7 350,00 бел. руб. (задаток – 735,00 бел. руб.);**

**Лот № 6: здание рыбо-колбасного цеха, общ. пл. 923,4 кв. м,** инв. № 602/С-22152**; навес рыбо-колбасного цеха, общ. пл. 155,2 кв. м,** инв. № 602/С-43157**; склад-гараж, общ. пл. 125,8 кв. м,** инв. № 602/С-43155**; гараж рыбо-колбасного цеха, общ. пл. 107,3 кв. м,** инв. № 602/С-43154**; мастерская рыбо-колбасного цеха, общ. пл. 84,3 кв. м,** инв. № 602/С-43153**; проходная колбасного цеха РКЦ, общ. пл. 14,8 кв. м,** инв. № 602/С-43156**.** Объекты расположены на земельном участке пл. **0,9173 га** (предоставлен на праве аренды) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Петра Гучка, 123.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **103 115,00 бел. руб. (задаток – 10 311,00 бел. руб.);**

**Лот № 7: магазин, общ. пл. 39,7 кв. м,** инв. № 602/С-45187, на земельном участке пл. **0,0179 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, д. Мижречье, ул. Центральная, 2А.** На земельном участке имеются ограничения прав в использовании – водоохранная зона р. Свислочь.

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 850,00 бел. руб. (задаток – 185,00 бел. руб.);**

**Лот № 8: магазин, общ. пл. 46,9 кв. м,** инв. № 602/С-45516, на земельном участке пл. **0,0337 га** (предоставлен на праве аренды) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, д. Любячка, 23А.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 2 550,00 бел. руб. (задаток – 255,00 бел. руб.);**

**Лот № 9: магазин, общ. пл. 77,1 кв. м,** инв. № 602/С-44082, на земельном участке пл. **0,0350 га** (предоставлен на праве аренды) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, Дричинский с/с, д. Белое, 41.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 2 830,00 бел. руб. (задаток – 283,00 бел. руб.);**

**Лот № 10: магазин, общ. пл. 158,3 кв. м,** инв. № 602/С-13806, на земельном участке пл. **0,0719 га** (предоставлен на праве аренды) **по адресу: Пуховичский район, Руденский п/с, д. Анетово, ул. Цветочная, 20А.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 11 300,00 бел. руб. (задаток – 1 130,00 бел. руб.)**

**Лот № 11: магазин, общ. пл. 98,6 кв. м,** инв. № 602/С-48296, на земельном участке пл. **0,0689 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, Пуховичский район, Правдинский п/с, д. Пристань, 15А.** Начальная цена с НДС (20 %) – **3 450,00 бел. руб. (задаток – 345,00 бел. руб.).**

**Задатки 10 % от начальной цены, перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущие извещения опубликованы в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») от 08.07.2017 и газете «Звязда» от 19.12.2017, 13.02.2018 и 15.05.2018. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **16.08.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.08.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Кривичское РТП», Минская область, Мядельский р-н, г. п. Кривичи, ул. К. Маркса, 10 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1 – здание магазина** (633/С-13414, 106,1 кв. м, составные части: пристройка, дощатый сарай, уборная). Адрес: Минская обл., **Мядельский р-н, Нарочский с/с, д. Швакшты, д. 1А.** Сведения о земельном участке: предоставлен пл. **0,0366** га на праве аренды сроком по 23.01.2113 для обслуживания здания магазина. **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 5 000,00 бел. руб.**

**Лот № 2 – здание магазина** (633/С-13690, 164,9 кв. м, составные части: две пристройки, блочный сарай). Адрес: Минская обл., **Мядельский р-н, Кривичский с/с, д. Парубки, пер. Первомайский, 1А.** Сведения о земельном участке: предоставлен пл. **0,1166** га на праве аренды сроком по 13.10.2113 для обслуживания здания магазина. Ограничения прав: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, пл. 0,0077 га. **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 12 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |
|---|---|

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете **«Звязда» от 02.05.2018**

**Аукцион состоится 28.08.2018 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 24.08.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by

## Проведение третьих повторных торгов по продаже имущества ООО «Энергостимул»

| № лота | Наименование лота | Начальная цена, руб. (без НДС) | Сумма задатка, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 11 | Анализатор электрической сети ENA500 | 2 480,34 | 248,03 | 124,02 |

Цена указана без НДС. (УСН)

Местонахождение лотов: **Минская область, г. Вилейка, ул. Шубина, д. 105**

Торги в электронной форме (далее – торги) будут проведены на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY:

**начало – 23 августа 2018 г., в 09.00, окончание – 23 августа 2018 г., в 17.00.**

**Письменная заявка на участие в торгах и копия документа, свидетельствующего об оплате задатка, подается по 21.08.2018 на адрес электронной почты организатора торгов: torgi24@tut.by.**

Задаток на участие по каждому лоту составляет 10 % от его начальной цены и должен быть перечислен по **21.08.2018** на расчетный счет организатора торгов – ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Корженевского, 14, оф. 404, УНП 191514793, р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код (BIC) UNBSBY2X, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в электронных торгах **23.08.2018.**

Организатор торгов: **ООО «Расантехторг»,** тел. +375 (29) 670-30-84.

Продавец: ООО **«Энергостимул»,** в лице управляющего ООО «БизнесУэй», тел. +375 (29) 165-33-65.

Ознакомиться с лотами можно в будние дни с 09:00 до 17:00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия.

Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в электронных торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by и на сайте **WWW.TORGI24.BY.**

## УП «Белконфискат»
## обьявляет о проведении электронных торгов 06.09.2018 г. по продаже имущества, принадлежащего Лысковец С. К.

Мотоцикл Harley Davidson, 2009 г. в., бензин,начальной стоимостью 19 120 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 90431606

## Частное предприятие «Эволюция Бизнеса» проводит открытые торги в форме аукциона по продаже имущества ОДО «Хоруженцы», находящегося в ликвидации

| № лота | Наименование лота | Кол-во, шт. | Начальная цена лота без НДС, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Ставка НДС при реализации |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль легковой внедорожник Kia Sportage 2.0 4WD 5 дв., 150 л. с., 6АКПП, 2012 г. в. (Примечание: согласно заключению СТО нуждается в капитальном ремонте двигателя, ремонте подвески, замене рулевой рейки и лобового стекла) | 1 | 12 500,00 | 625,00 | 20 % |

| | |
|---|---|
| Продавец | ОДО «Хоруженцы», г. Минск, пр. Независимости, 107 – 11, тел. +375 29 651-81-61 |
| Организатор торгов | Частное предприятие «Эволюция Бизнеса», тел. +375 29 651 81 61 |
| Место проведения торгов | г. Минск, пр. Независимости, 107 – 11 |
| Дата и время проведения торгов | 03.09.2018 г. в 11.00 |
| Срок подачи заявок | По 31.08.2018 г. до 17.00 |
| Порядок подачи заявок | Принимаются организатором торгов по месту проведения торгов либо по адресу: 220023, г. Минск, а/я 14 |
| Задаток и реквизиты для оплаты | **10 % от суммы заявки с НДС (1500,00 руб.).**<br>Частное предприятие «Эволюция Бизнеса» счет BY42BLNB30120000033247000933 в ОАО «Белорусский народный банк» ЦБУ № 7, (BIC) BLNBBY2X, УНП 191906926 |
| Условия аукциона | 1. Шаг аукциона 5 %. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов в течение 2 (двух) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.<br>2. Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета торгов осуществляется не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи. Данные условия будут установлены в договоре купли-продажи предмета торгов между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.<br>3. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.<br>4. Победитель торгов возмещает стоимость проведения торгов |

**Ознакомиться с предметом аукциона можно, связавшись с продавцом либо с организаторм аукциона, тел.: (+375 17) 267-25-91 (24); (+375 29) 651-81-61**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, свидетельства о гос. регистрации; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 24 августа 2018 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества со снижением начальной цены на 50 %

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. без НДС | Местонахождение имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Склад сланцевой золы, площадь 66 кв. м<br>Подъездной ж/д путь не общего пользования<br>Битумное хранилище, объем 640 тн<br>Битумное хранилище, объем 250 тн<br>Котельная<br>Бытовой корпус<br>Склад сланцевой золы, площадь 66 кв. м<br>Склад сланцевой золы, площадь 52 кв. м<br>Мазутная насосная<br>Ограждение из блоков к битумным емкостям<br>Здание для битумовара<br>Площадка из ж/б плит к КТП<br>Покрытие, площадь 1499 кв. м<br>Мастерская<br>Емкость, объем 60 куб. м<br>Емкость, объем 60 куб. м<br>Емкость, объем 50 куб. м<br>Емкость, объем 50 куб. м<br>Емкость, объем 2 куб. м<br>Нефтерезервуар, объем 4 куб. м<br>Емкость, объем 25 куб. м<br>Емкость, объем 25 куб. м<br>Битумоплавильня, объем 4*10 куб. м<br>Зеленые насаждения<br>Внеплощадные электрические сети<br>Верстак металлический<br>Канализационная сеть | 115 690,50 | Могилевская область, Бобруйский р-н, южнее д. Ковали (в районе ст. Телуша) | 11 569,05 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: 24.08.2018 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY91BPSB30121192411129330000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 21.08.2018 г.; время: 17.00.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.

8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда» № 52 от 18.03.2017 г., № 100 от 30.05.2017 г., № 116 от 21.06.2017 г., № 134 от 15.07.2017, № 211 от 01.11.2017, № 222 от 17.11.2017, № 3 от 13.01.2018, № 18 от 26.01.2018, № 27 от 08.02.2018, № 46 от 10.03.2018, № 66 от 26.05.2018; № 130 от 11.07.2018.

■ Тэхналогіі

# Крыёніка прапануе новае жыццё

## Першага замарожанага чалавека «абудзяць» ужо праз 50 гадоў?

**Крыёніка — гэта тэхналогія захавання цела (а ў некаторых выпадках — мозга) у стане глыбокага астуджэння, але з падтрыманнем усіх жыццёва важных функцый. Яшчэ нядаўна яна «жыла» толькі ў фантастычнай літаратуры і фільмах, але пакрысе навука пачала распрацоўваць гэтую галіну. Некаторыя людзі, якія пакутуюць ад невылечных захворванняў, выкарыстоўваюць крыёніку для таго, каб «дажыць» да таго моманту, калі з'явіцца патрэбныя лекі. Іншыя ж звяртаюцца да яе для «падарожжа ў часе» з мэтай прачнуцца ў далёкай будучыні.**



Аднак, нягледзячы на прывабнасць тэхналогіі, ёсць у яе істотны мінус: замарозіць чалавека можна, а вось бяспечна размарозіць (прынамсі на сённяшні момант) нельга. Але прэзідэнт Інстытута крыёнікі ў Мічыгане (ЗША) Дэніс Кавальскі нядаўна зрабіў сенсацыйную заяву: першага крыязамарожанага чалавека можна будзе «абудзіць» ужо праз 50—100 гадоў. Больш за тое, пажылыя пацыенты могуць разлічваць на «ўваскрашэнне» ў маладых целах.

Для пачатку варта расказаць, што Інстытут крыёнікі — гэта некамерцыйная арганізацыя, якая аказвае паслугі па крыязамарозцы чалавека за 28 000 долараў ЗША. Як заявіў Кавальскі ў інтэрв'ю выданню Daily Mail, цяпер у лабараторыі знаходзіцца 160 замарожаных людзей і каля сотні хатніх гадаванцаў, а яшчэ каля 2000 чалавек пагадзіліся замарозіць у яго інстытуце сваё цела пасля смерці. Паводле слоў Кавальскі, крыёніка на сённяшні дзень — гэта «найлепшы спосаб падмануць смерць». Амаложванне чалавека ў Інстытуце крыёнікі будзе адбывацца пры дапамозе адмысловай тэхналогіі тэрапіі ствалавымі клеткамі.

«Пасля спынення сэрца ва ўрачоў ёсць ад пяці хвілін да паўгадзіны, каб выратаваць чалавека. Гэты час залежыць ад тэмпературы цела і навакольнага асяроддзя. Наша работа з'яўляецца працягам даследавання ствалавых клетак, ін'екцыі якіх у будучыні мы будзем уводзіць замарожаным пацыентам для аднаўлення іх пашкоджаных тканак. Калі б усё, пра што мы клапаціліся, — гэта ваша ДНК, а не ўспаміны і вопыт, то вас можна было б проста кланіраваць. Але гэта быў бы ўжо зусім іншы чалавек».

Дырэктар Інстытута крыёнікі мяркуе, што ў наступныя паўстагоддзя ў іх з'явіцца патрэбная тэхналогія для таго, каб вярнуць да жыцця першых крыязамарожаных пацыентаў. На сённяшні момант асноўнай мэтай інстытута з'яўляецца захаванне не толькі цела, але і мозга разам з усёй інфармацыяй, якая ў ім захоўваецца. На словах усё гэта, вядома, выглядае вельмі прывабна, але, калі ўлічыць той факт, што за апошнія дзесяцігоддзі ў крыязамарозцы не адбылося асабліва значных дасягненняў, вучоныя не асабліва вераць у нечаканы прарыў, хай нават і праз 100 гадоў ■

■ У свеце жывёл

# САМЫЯ РАЗУМНЫЯ БЕСХРЫБЕТНЫЯ

**Васьмінога назвалі так, бо лічыцца, што ў яго восем ног. Аднак ног у яго, уласна кажучы, усяго дзве, таму што для перамяшчэння па дне ён выкарыстоўвае пару задніх канечнасцяў, а ўсе астатнія шчупальцы выконваюць функцыю рук.**



У васьмінога тры сэрцы. Галоўнае пераганяе кроў па целе, астатнія штурхаюць яе цераз жабры. У крыві васьмінога няма гемаглабіну, але ўтрымліваецца вялікая колькасць медзі, таму кроў у гэтых галаваногіх блакітная. Гэта бесхрыбетнае можа дасягаць вагі ў 50 кілаграмаў і даўжыні да 3 метраў. Самы буйны васьміног быў злоўлены недалёка ад узбярэжжа ЗША ў 1945 годзе, яго вага была 180 кг, а даўжыня — цэлых 8 метраў.

Навукоўцы не раз спрабавалі высвятліць, якія жывёлы самыя разумныя, і, па адной з версій, у дзясятак самых разумных разам з дэльфінамі, некаторымі прыматамі і пацукамі, яны ўключылі і васьміногаў. Васьміног з'яўляецца самай разумнай з бесхрыбетных жывёл, хоць і лічыцца далёкім сваяком садовых смаўжоў і слімакоў. Яго мозг мае форму абаранка, а ў кожным шчупальцы знаходзіцца яго «філіялы», гэтакія мініяцюрныя копіі. На кожным шчупальцы ў жывёлы знаходзіцца 240 прысосак, а ўсяго іх у галаваногага — каля 1900. Навукоўцы ўпэўнены, што шчупальцы васьмінога могуць здзяйсняць пэўныя дзеянні і без удзелу яго галаўнога мозга.

У васьміногаў ёсць незвычайная здольнасць — дзякуючы адсутнасці шкілета яны могуць мяняць форму. Напрыклад, некаторыя васьміногі падчас палявання пластаюцца на марскім дне, маскіруючыся пад камбалу. Вядома здольнасць васьміногаў пранікаць цераз дзіўна маленькія адтуліны.

Звычайны васьміног валодае здольнасцю змяняць афарбоўку, прыстасоўваючыся да навакольнага асяроддзя. Гэта тлумачыцца наяўнасцю ў яго скуры клетак з рознымі пігментамі, здольных расцягвацца або сціскацца ў залежнасці ад успрымання органаў пачуццяў. Звычайная афарбоўка — карычневая. Калі васьміног напалоханы — ён бялее, калі разгневаны, чырванее.

Гэтыя галаваногія паддаюцца дрэсіроўцы, адрозніваюць геаметрычныя фігуры. Яны знаходзяць і запамінаюць выйсце са складаных лабірынтаў, могуць супрацоўнічаць з іншымі драпежнікамі, дамаўляючыся аб сумесным паляванні. Васьміногі маюць добрую памяць — пазнаюць людзей, якія іх кормяць, і выказваюць да іх сваё стаўленне. Вядомы выпадак, калі адзін васьміног, што жыў у акварыуме, не любіў работніцу, якая за ім наглядала, і ўвесь час абліваў яе вадой. Дзяўчына звольнілася, але калі праз некалькі месяцаў зноў зайшла на старую работу, васьміног яе пазнаў — і зноў абліў вадой.

Васьміногі не горш за малпаў могуць выкарыстоўваць прылады працы. Вядомыя выпадкі, калі бесхрыбетныя выкарыстоўвалі кавалкі дрэва, каб раскрываць ракавіны малюскаў. Іншыя ўмелі адкрываць накрыўкі пластыкавых бутэлек і нават вылазіць са слоіка, адкручваючы крышку знутры.

Васьміногі вельмі назіральныя. Яны капіруюць паводзіны адзін аднаго. Варта аднаму чаму-небудзь навучыцца, як іншыя адразу ж пачынаюць ужываць яго вопыт на практыцы. Яны таксама цікаўныя. Яны не небяспечныя для людзей, і выпадкі нападзенняў васьміногаў на чалавека вельмі рэдкія. Аднак васьміног, убачыўшы аквалангіста, можа абвіць яго нагу шчупальцамі, проста з цікаўнасці, каб памацаць, а затым адпусціць.

Асабістае жыццё васьміногаў нельга назваць шчаслівым. Самцы часта становяцца ахвярамі самак, а самкі доўга не жывуць. Яны адкладаюць яйкі ўсяго адзін раз у жыцці, але затое якая колькасць — 100 тысяч яек! Самка беражліва даглядае іх, не выходзячы са свайго сховішча. Яна ў гэты час нічога не есць, і так працягваецца паўгода, а то і больш. А пасля з'яўлення малых, калі праз тыдзень яны пачынаюць самастойна харчавацца, самка васьмінога паміраe ад знясілення. У сярэднім васьміногі жывуць 1-2 гады, і тыя, хто дажыў да 4 гадоў, з'яўляюцца доўгажыхарамі ■

# ДНК РАСКАЗАЛА ПРА НАШЫХ ПРОДКАЎ

**Не так даўно навукоўцы выкарыстоўвалі ДНК аднаго з самых старажытных англійскіх шкілетаў (узростам каля 10 000 гадоў), каб высветліць, як выглядалі першыя жыхары Брытаніі. Зрэшты, ДНК старажытнага шкілета бярэцца ўжо не першы раз і раскрывае дзіўныя факты пра нашых старажытных продкаў. Хуткае развіццё секвеніравання геному (вызначэнне паслядоўнасці, што дазваляе раскрыць розную інфармацыю, якую нясуць гены) за некалькі апошніх дзесяцігоддзяў адкрыла новае акно ў мінулае.**

### Зносіны з неандэртальцамі

Археолагі даўно здагадаліся, што сучасныя людзі і неандэртальцы жылі разам у Еўропе і Азіі, але толькі нядаўна стаў вядомы характар іх сужыцця. Фактычна пасля таго, як у 2008 годзе быў секвеніраваны першы мітахандрыяльны геном неандэртальца (ДНК, размешчаная ў мітахондрыі клеткі), генетыкі і археолагі доўгі час не маглі зразумець, ці звязаныя людзі з нашым найбліжэйшым сваяком у нейкай меры ці не.

Калі ў 2010 годзе быў секвеніраваны поўны геном неандэртальца, параўнанне з ДНК сучаснага чалавека паказала, што ўсе неафрыканскія людзі валодаюць кавалачкамі ДНК неандэртальцаў, замешанымі ў геноме. Гэта магло адбыцца, калі б людзі і неандэртальцы перамяшаліся ўсяго 50 000 гадоў таму. Пасля, праз некалькі гадоў, гэта пацвердзілася.

### Што дазволіла жыць у гарах

Як ні дзіўна, нашы продкі размаўлялі з неандэртальцамі не проста як сябры. Калі з закамянелага пальца, знойдзенага ў пячоры ў Алтайскіх гарах у Сібіры, была секвеніравана ДНК, а палец, як лічылі, належаў неандэртальцу, генетычны аналіз паказаў, што гэта быў фактычна новы від чалавека, які адрозніваўся ад неандэртальцаў, але быў цесна з імі звязаны. Аналіз поўнага геному паказаў, што гэтыя «дзянісаўскія людзі» таксама мелі сексуальныя зносіны з нашымі продкамі.

Тыбетцы, якія жывуць сярод самых высокіх у свеце гор, здольныя выжываць на вышынях, на якіх большасць людзей проста задыхаюцца праз адсутнасць кіслароду. Генетычны аналіз паказаў, што яны, нароўні з эфіопскімі і андскімі горцамі, маюць асаблівыя генетычныя адаптацыі, якія дазваляюць ім апрацоўваць кісларод у разрэджаным горным паветры. Цяпер мы ведаем, што гэтыя генетычныя адаптацыі да вышыні ў тыбетцаў — у іх ёсць канкрэтны варыянт гена EPAS1 — на самай справе былі перанятыя праз радавое спароўванне з дзянісаўскімі людзьмі.

Высветлілася, што паляпшэнне імунітэту, метабалізму і дыеты сярод сучасных людзей таксама звязана з карыснымі генетычнымі варыянтамі, успадкаванымі ў выніку гэтага скрыжавання як з неандэртальцамі, так і з дзянісаўскімі людзьмі.

### Хуткая эвалюцыя

Скрыжаванне з іншымі відамі тлумачыць толькі невялікую частку чалавечых адаптацый. Аналіз ДНК паказвае нам, што па меры таго, як нашы продкі разыходзіліся па свеце, яны эвалюцыяніравалі ў розным асяроддзі і адаптаваліся да ежы хутчэй, чым лічылася раней. Напрыклад, відавочным узорам хуткай чалавечай адаптацыі з'яўляецца выпрацоўка пераноснасці лактозы. Здольнасць пераварыць малако пасля трох гадоў не ўніверсальная — і раней меркавалася, што яна распаўсюдзілася ў Еўропе разам з сельскай гаспадаркай Блізкага Усходу прыкладна 10 000 гадоў таму.

Але калі мы вывучаем ДНК людзей за апошнія 10 000 гадоў, гэтая адаптацыя, якая зараз з'яўляецца звычайнай з'явай у Паўночнай Еўропе, адсутнічала яшчэ 4000 гадоў таму, і нават потым была досыць рэдкай з'явай. Гэта азначае, што распаўсюджванне пераноснасці лактозы ў Еўропе павінна было працякаць неверагодна хутка.

### Першыя англічане былі цемнаскурыя

ДНК аднаго з першых людзей у Брытаніі, Cheddar Man, паказвае, што ён хутчэй за ўсё быў цемнаскуры і блакітнавокі. І ён таксама не мог пераварыць малако. Хоць гэта цікава і нават збольшага дзіўна, даведацца, што некаторыя з першых людзей, якія насялялі востраў, цяпер вядомы як Брытанія, мелі цёмную скуру і блакітныя вочы, гэтая дзіўная камбінацыя зусім не такая ўжо і непрадказальная, улічваючы тое, што мы даведаліся пра палеалітычную Еўропу з ДНК старажытных людзей. Цёмная скура была даволі распаўсюджана сярод паляўнічых-збіральнікаў накшталт Cheddar Man, якія жылі ў Еўропе на працягу тысячагоддзяў пасля таго, як жыў ён, — і блакітныя вочы ў іх былі з часоў ледніковага перыяду.

### Белая скура прыйшла ў Еўропу з Усходу

Такім чынам, калі 10 000 гадоў назад у Еўропе была распаўсюджаная цёмная скура, як еўрапейцы абзавяліся сваёй белай скурай? У Еўропе больш няма паляўнічых-збіральнікаў, ды і па ўсім свеце іх засталося вельмі няшмат. Сельская гаспадарка замяніла паляванне як лад жыцця, а як вядома, у Еўропе сельская гаспадарка распаўсюдзілася з Блізкага Усходу. Генетыка раскрыла нам, што гэта змяненне таксама звязана са значным рухам людзей.

Таксама мы ведаем цяпер, што каля 5000 гадоў назад у Еўропу быў вялікі прыток людзей з расійскіх і ўкраінскіх стэпаў (тэрытарыяльна). Разам з ДНК гэтыя людзі прынеслі прыручаных коней і кола ў Еўропу, а разам з тым, магчыма, протаіндаеўрапейскую мову, з якой пайшлі амаль усе сучасныя еўрапейскія мовы. Верагодней за ўсё, разам з імі ў Еўропе з'явілася і белая скура. Лічыцца, што светлая пігментацыя скуры дапамагае людзям лепш паглынаць сонечнае святло і сінтэзаваць з яго вітамін D.

**Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**



# У кругасветку — на матацыкле

## Кацярына Дубаневіч плануе пераадолець шлях у 100 тысяч км на двух колах у поўнай адзіноце



**ЦЕРАЗ Расію, Казахстан і краіны Сярэдняй Азіі яна трапіць у Аўстралію, потым у ЗША, Паўднёвую Амерыку і Афрыку, ну а затым цераз Еўропу вернецца дадому. На ўсё Кацярына плануе выдаткаваць 500 дзён. Матавандроўніца стартуе ўжо зусім хутка — 18 жніўня, пра тое, як праходзіць яе падрыхтоўка і якія неспадзяванкі могуць чакаць у дарозе, Кацярына расказала нашай газеце.**

### Ідэя аб кругасветцы не была спантанная

Сёння вадзіцельскі стаж Кацярыны 10 гадоў, з іх 8 яна за рулём матацыкла. Упершыню на двухколавым сродку перамяшчэння дзяўчына пракацілася ў 14 гадоў па звычайным полі, тады сумесь захаплення і страху спарадзіла жаданне паўтарыць. «Потым пасябравала з матацыклістамі і каталася другім нумарам. Сама ж села за руль даволі позна — у 25 гадоў, — расказвае Кацярына. — Але лічу, што так нават лепш: інстынкт самазахавання з узростам развіваецца, і ў мяне нават не ўзнікала жадання хуліганіць або парушаць ПДР». Канчаткова ў матацыклы дзяўчына ўлюбілася ўжо з першых падарожжаў. Яна кажа, што менавіта гэты транспарт дорыць свабоду — як перамяшчэння, так і ўнутраную. «Калі пасля цяжкага працоўнага дня проста сесці і пракаціцца за горад, да прыгожага возера, то ўсе праблемы становяцца менш значнымі, стрэс праходзіць і можна хутка знайсці правільнае рашэнне», — дзеліцца Каця.

Шэсць гадоў таму яна пачала захапляцца падарожжамі, упершыню выехала самастойна за межы краіны ў 2012 годзе на маленькім рукавым матацыкле «Мінск». «Сябар расказаў пра Куршскую касу, якая злучае Літву з Калінінградскай вобласцю. Падарожжа стала прыгодай — я прабіла кола ўжо на літоўскім баку, у суседній вёсачцы знайшла шынамантаж, дзе паставілі шнур у дзірку, а ў Вільнюсе ўжо замянілі кола. Уражанняў ад самастойнай паездкі было столькі, што стала ездзіць кожныя выходныя, а ў адпачынак адправілася адна цераз Альпы ў Венецыю. З таго моманту падарожжы сталі часткай майго жыцця, а думка пра кругасветку настойліва пасялілася ў маёй душы», — расказвае матавандроўніца.

### Еду зусім адна, але ведаю, што сустрэну шмат добрых людзей

Кацярына заўсёды падарожнічае адна. Яна кажа, што менавіта такі адпачынак падыходзіць яе душы, так яна можа адчуць абсалютную гармонію з сабой і навакольным светам. «Я звычайны чалавек і, вядома ж, баюся многага. Паломкі непазбежныя, пытанне часу, таму муж старанна рыхтуе мой матацыкл і збірае мне з сабой інструменты, рамонтны камплект і запчасткі». Дзяўчына адзначае, што больш, чым тэхнічная частка яе палохае бяспека ў афрыканскіх краінах, трапічныя хваробы, беспарадак і культура кіравання. «Засцерагчыся ад усяго немагчыма, але я буду старацца мінімізаваць рызыкі, не лезці на ражон і старанна планаваць маршрут. Думаю, што самымі цікавымі стануць краіны Паўднёвай Амерыкі і Афрыка».

Кацярына плануе ўкласці сваю вандроўку ў 500 дзён, але гэта арыенціровачны тэрмін, які, магчыма, будзе скарэкціраваны ў залежнасці ад знешніх абставін. У фінансавым сэнсе такое падарожжа вельмі дарагое мерапрыемства, Кацярына кажа, што патрэбнай сумы ў яе няма да гэтага часу, хоць да старту застаецца крыху больш за два тыдні. «Буду падпрацоўваць аддалена ў дарозе або затрымлівацца ў розных месцах, каб была магчымасць рухацца далей. Падтрымаць праект можна на маім сайце. Маральна будзе нашмат цяжэй, адзінота, цяжкасці — не магу сказаць, што цалкам гатовая да іх, але прыкладу ўсе намаганні, каб падарожжа прайшло годна».



Сачыць за Кацярынай падчас падарожжа можна будзе на яе асабістым сайце motokatrina.com, дзе дзяўчына будзе публікаваць справаздачы, а таксама ва ўсіх сацыяльных сетках. «З сабой я бяру спадарожнікавы трэкер, які кожныя пяць хвілін будзе адпраўляць звесткі аб маім месцазнаходжанні на сайт», — адзначае Каця.

Спадарожнікавы трэкер — даволі просты прыбор, ёсць кнопка «SOS» — гэта, як кажа Кацярына, калі ўжо паўзеш, паміраеш і трэба тэрмінова прасіць паратунку. Кнопка «Help» — у мяне праблемы, але я ў парадку. Кнопка «Ok» — са мной усё добра, але сувязі няма. І кнопка, на якую вы можаце запісаць любое паведамленне. Пры націску на вышэйзгаданыя кнопкі трэкер зробіць рассылку з паведамленнем і каардынатамі вандроўніцы на 10 нумароў або адрасоў электроннай пошты, якія чалавек загадзя пакінуў у сваім акаўнце.

### Муж падтрымлівае мяне ва ўсім

Разам са сваім абраннікам Кацярына ўжо 5 гадоў, сумесна яны прыйшлі да таго, што трэба паспрабаваць ажыццявіць Кацыну мару. «Бацькі вельмі перажываюць, асабліва мама, але жадаюць мне ўдачы і будуць сачыць за кожным крокам», — расказвае Кацярына.

На матацыкле дзяўчына ўжо наведала 26 краін, з самых яркіх уражанняў яна называе падарожжа па Фарэрскіх астравах, Ісландыі і Курыльскіх астравах. «Чым далей вы едзеце ад мацерыкоў, тым больш першародную прыроду можна знайсці, — дзеліцца дзяўчына. — Таксама вельмі здзівіла Расія — бязмежнай тайгой, разнастайным ландшафтам і бязмежнай дабрынёй людзей».

### Перш за ўсё бяру неабходнае

Дзяўчына пралічыла, што яе багаж не павінен перавышаць 50 кг. Для аўтаномнага падарожжа яна возьме з сабой палатку, спальнік, дыванок, гарэлку для гатавання ежы, посуд і іншыя турыстычныя прыналежнасці. Для матацыкла — інструменты, запчасткі, расходнікі. Сабе — адзенне для розных умоў надвор'я. «І магчыма, нават сукенку, не варта забываць, што я дзяўчына, — усміхаецца Каця. — Шмат месца зойме абсталяванне — фотаапарат, штатыў, ноўтбук, камера, паўэрбэнкі і іншае. Таксама я набыла воданепранікальныя тубусы для захоўвання дакументаў і іх копій».



Марка Кацінага матацыкла BMW GS, ён мае адносна вялікі бак (крыху больш за 17 літраў). Пры расходзе 3,7-4 л на «сотню» на ім можна праехаць 400 км на адной запраўцы. Такі выдатак атрымліваецца, калі ехаць 100—110 км/г, імчацца з большай хуткасцю дзяўчына не любіць, бо гэта пазбаўляе яе магчымасці разглядзець мясціны, па якіх яна падарожнічае. «Безумоўна, трапяцца месцы, дзе з палівам будзе напружаная сітуацыя, для гэтага я бяру з сабой дзве каністры. У цэлым жа мой матацыкл здольны спажываць паліва практычна любой якасці», — адзначае падарожніца.

### Падрыхтоўка да падарожжа пачалася за год

На сённяшні дзень у Каці практычна ўсё гатова. Матацыкл цяпер у мужа ў майстэрні — дапрацоўваюцца апошнія штрыхі. Пашпарт вандроўніцы — у японскім пасольстве. «А я стараюся нічога не выпусціць і складаю план-графік руху на першы этап маршруту — Расію і Сярэднюю Азію».

Самая вялікая праблема ў падрыхтоўцы — гэта візы, дакладней іх абмежаваны тэрмін уезду ў некаторыя краіны. «Вы атрымліваеце візу і павінны на працягу 2-3 месяцаў уехаць у краіну, — тлумачыць Кацярына. — Таму я зрабіла толькі «доўгія» візы — гэта Аўстралія і ЗША, таксама падала дакументы на японскую. Аўстралійская віза падаецца анлайн, проста загружаеце адсканаваныя дакументы і чакаеце 19 дзён — на электронную пошту прыйдзе бланк з кенгуру, пацвярджэнне або абвяржэнне, як пашанцуе. Яшчэ застанецца шэнген, а астатнія буду рабіць у дарозе. Для хуткага правозу матацыкла праз межы афармліла Carnet de passages en doune — міжнародную мытную дэкларацыю, якая значна аблягчае ўсе мытныя працэдуры».

Іншая важная частка падрыхтоўкі — гэта прышчэпкі. У Беларусі можна зрабіць толькі невялікую частку ад усіх прышчэпак, якія неабходныя ў кругасветным падарожжы, і пачынаць іх рабіць трэба загадзя, бо некаторыя варта праводзіць паэтапна і з вялікімі перапынкамі. Напрыклад, Каця ўжо прышчапілася ад брушнога тыфу, дыфтэрыі, слупняку, гепатыту і жоўтай ліхаманкі. Некаторыя прышчэпкі, якія рэкамендуюць турыстам, што вандруюць па такім маршруце, у Беларусі наогул не робяць.

Бывалыя кругасветныя вандроўнікі кажуць, што, як правіла, прызначаны маршрут супадае з рэальным прыкладна на 50 % і ад самога вандроўніка залежыць толькі 50 % поспеху мерапрыемства. «Астатняе — Сусвет, лёс, анёл-ахоўнік», — разважае сураразмоўніца. Па ходзе сваёй кругасветкі Каця будзе расказваць замежнікам пра Беларусь, акрамя таго, дзяўчына падрыхтуе спецыяльныя паштоўкі з выдатнымі мясцінамі нашай краіны, якія будзе дарыць людзям, што сустрэнуцца на яе шляху. «А што будзе пасля майго кругасветнага падарожжа? Думаю, што я паспрабую напісаць кнігу, упэўнена, мне будзе, што расказаць і чым падзяліцца».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ЗЯМЛЯ МАКСІМА




107 гадоў таму ў фальварак Ракуцёўшчына на летні адпачынак завітаў малады паэт Максім Багдановіч. Два незабыўныя месяцы ў гэтых маляўнічых мясцінах (як і ўсё падарожжа па Беларусі) з'явіліся вызначальнымі для творчага шляху будучага класіка. У Ракуцёўшчыне ён напоўніцу адчуў сябе беларускім паэтам, тут нарадзіліся бессмяротныя радкі для яго будучага зборніка «Вянок».

Кожны год Міністэрства культуры, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Маладзечанскі райвыканкам праводзяць свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета». Запамінальна прайшло яно і сёлета — аматары творчасці геніяльнага беларускага паэта ўсклалі кветкі ў памятных мясцінах, пабывалі ў музеі, паслухалі выступленні паэтаў і пісьменнікаў, спевакоў, музыкантаў, паўдзельнічалі ў пазнавальных інтэрактыўных забавах.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**










*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*



**ООО «Центр эксперт-услуг плюс» извещает**
**О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**
**по продаже имущества, принадлежащего ООО «Веста»**
**УНП 400053655 (Гомельская обл., г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1)**

| Лот № | Наименование объекта аукциона | Начальная цена лота с НДС, руб. | Задаток, руб. | Шаг аукциона 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Материалы: профили мебельные, кромкооблицовочный материал, остатки ДСП, МДФ и прочих плитных материалов, стеклоизделия в ассортименте, мебельная фурнитура | 1 391,09 | 139,1 | 69,55 |

Задаток перечисляется на расчетный счет BY33PJCB30124047901000000933 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, БИК PJCBBY2X, УНП 491331464, получатель платежа – ООО «Центр эксперт-услуг плюс», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 01.08.2018 г.

Аукцион состоится 13 августа 2018 г. в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 10 августа 2018 г. до 14.00 по указанному адресу.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация об предмете аукциона, размещены на сайте auction.standard.by.

Участник, ставший победителем аукциона или единственным участником аукциона, который согласится приобрести предмет аукциона по начальной цене продажи, увеличенной на 5 %, обязан:

в течение 3 (трех) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить лицу (Заказчику или Исполнителю в соответствии с договором), понесшему затраты на организацию и проведение аукциона (расходы на публикацию обязательных извещений, подготовку и публикацию рекламных материалов). Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам, в случае повторного выставления объекта на торги и определяется на основании представленных документов; в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить с Заказчиком договор купли-продажи предмета аукциона (далее – договор купли-продажи).

Результаты аукциона подлежат аннулированию организатором аукциона в случае, если победитель аукциона уклоняется или отказывается в установленные сроки от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам аукциона, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением аукциона.

Организатором аукциона является ООО «Центр эксперт-услуг плюс» (адрес: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а).

По вопросам участия в аукционе обращаться по телефонам: 8-029-6488306, тел./факс 8-0232 21-21-61.

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 2233225 **считать недействительным.**

УНП 100122726

Утерянный студенческий билет № 1690004, выданный Белорусским государственным аграрным техническим университетом 01.09.2016 г. на имя Тувакова Атанияза, **считать недействительным.**

Утерянное свидетельство о государственной регистрации (УНП 192236308) от 14 марта 2014 года и Устав ЧТПУП «Бэй-Хемми» **считать недействительными.**

**К сведению акционеров ОАО «Универсам «Рига»**

Выплата дивидендов по итогам работы за I полугодие 2018 года будет производиться **9, 10 и 13 августа 2018 года** с 11.00 до 17.00 по адресу: 220040, г. Минск, ул. Сурганова, 50, 2-й этаж, бухгалтерия «ОАО «Универсам «Рига».

УНП 100299678

**Уважаемые акционеры ОАО «Белхим»**
**14 августа 2018 г. в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белхим», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34**

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34 (зал переговоров).

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О выплате дивидендов по итогам работы ОАО «Белхим» за первое полугодие 2018 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу:

г. Минск, ул. Короля, 34 с 3 августа по 13 августа 2018 г. (с 9.00 до 16.00), либо 14.08.2018 по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 06.08.2018.

Регистрация участников собрания 14 августа 2018 г. с 15.00 до 16.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 14 августа 2018 года в 16.00.**

Для регистрации при себе иметь документы, удостоверяющие личность (паспорт).

УНП 100122845

**ОАО «Опытный завод металлоконструкций» проводит внеочередное собрание акционеров по адресу: г. Минск, пр-т Пушкина, 68, зал заседаний, дата проведения собрания: 14 авгута 2018 года, начало – 15.30**

Повестка дня:

1. Рассмотрение выполнения управляющей организацией ООО «КверкСтройИнвест» договора № 1 от 21 января 2016 года «О передаче полномочий единоличного исполнительного органа хозяйственного общества управляющей организации» за январь – июнь 2018 года.

2. О расторжении договора № 1 от 21 января 2016 года «О передаче полномочий единоличного исполнительного органа хозяйственного общества управляющей организации» между ОАО «Опытный завод металлоконструкций» и ООО «КверкСтройИнвест» по взаимному согласию сторон.

3. Об утверждении договора № 2 от 14 августа 2018 года «О передаче полномочий единоличного исполнительного органа хозяйственного общества управляющей организации ООО «КверкСтройИнвест».

Для регистрации при себе иметь следующие документы: паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Справки по телефону 204-30-72.

УНН 100135691

**ВНИМАНИЕ**
**Янушковичский сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 7 сентября 2018 г. в 15.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь зем. участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Хоружинцы, Лесная, 9 кадастровый номер 623288016101000077 | 0,1285 га | Возможность подключения к водопроводу | 3974,00 бел. руб. | 794 руб. 80 коп. | 1323 руб. 41 коп. + расходы на рекламу |
| 2 | д. Аскрышино, У-1, кадастровый номер 623288000601000028 | 0,2500 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 5000,00 руб. | 1000,00 руб. | 519,38 + расходы на рекламу |
| 3 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, 27А, кадастровый номер 623288001601000094 | 0,2125 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 4500,00 руб. | 900,00 руб. | 1356,96 + расходы на рекламу |
| 4 | Бориски, У-1, кадастровый номер 623288002101000012 | 0,2228 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 4500,00 бел. руб. | 900,00 руб. | 519,51 + расходы за рекламу |
| 5 | д. Мочулище, ул. Полевая, 1Б, кадастровый номер 623288010101000022 | 0,1599 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 3500,00 руб. | 700,00 бел. руб. | 1038,76 + расходы за рекламу |

Задаток перечисляется на р/счет: BIC: AKBBBY2X; счет № BY35AKBB36006191711040000000 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление «АСБ Беларусбанк» УКП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Аукцион состоится 7 сентября 2018 г. в 15.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 31 августа 2018 г. (последний день подачи заявления 31.08.2018 г. до 17.00) по адресу: Минская область, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная,10.

Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, (8 01774) 57 4 99.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА**

***ОРГАНИЗАТОР****: ЛУКОМЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ*

| № лота | Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | Начальная цена, руб. | Сумма задатка 10 %, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Витебская обл., Чашникский р-н., Лукомльский с/с, д. Белая Церковь, ул. Приозерная, 2У площадью 0,2461 225183000301000041 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | Водоохранная зона водного объекта (оз. В. Черное, оз. М. Черное, оз. Черейское) | 1448,00 + расходы, связанные с опубликованием объявления | 4000,00 | 400 ,00 |

Условия проведения аукциона:

наличие не менее двух участников;

заключение с Лукомльским сельским исполнительным комитетом соглашения.

Победителю аукциона, либо в случае признания аукциона несостоявшимся, единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность:

– возместить затраты, связанные с проведением аукциона;

– внести плату за земельный участок.

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории:

подключение к сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД.

Аукцион состоится **31 августа 2018 года в 15.00** по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.

Заявления и пакет необходимых документов предоставляются участниками с 8.00 до 17.00 по **28 августа 2018 года** включительно по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9.

1. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, подавшие в установленном порядке заявление на участие в аукционе, а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, в комиссию предоставляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования, а представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет р/с BY68AKBB36413290522002200000 в ЦБУ № 222 филиала № 215 ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Орша, БИК AKBBBY21215, УНП 300986851, код платежа – 4901, получатель – Лукомльский сельский исполнительный комитет.

Оплата стоимости предмета аукциона подлежащая возмещению Победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона.

Контактные телефоны: 8 (02133) 6 41 45, 6 94 35.

## Извещение о проведении электронных торгов

**Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 5 сентября 2018 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by) проводит электронные торги по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске. Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет**

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, в районе ул. Корженевского – ул. Кижеватова | 500000000004006204 | 2,9164 | Для строительства объекта «Многофункциональный общественный комплекс с перехватывающим паркингом в районе ул. Корженевского – ул. Кижеватова» / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 1 030 441,46 | 154 500,00 | 10 706,98 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: состав объекта строительства (функциональный состав комплекса) – торговый центр, объект общественного питания до 100 пос. мест, административно-деловой центр, многоуровневая автостоянка – перехватывающий паркинг (в т. ч. с возможностью использования подземного пространства); показатели по вместимости объектов строительства – общая площадь многофункционального комплекса с перехватывающим паркингом до 127 000 кв. м |
| 2 | г. Минск, ул. Неманская | 500000000006009113 | 0,1892 | Для строительства объекта «Торгово-обслуживающий объект по ул. Неманской в г. Минске» / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 74 191,87 | 11 100,00 | 9 829,73 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: состав объекта строительства – помещения торгово-бытового назначения, предприятие общественного питания; показатели по вместимости объекта – до 3 000 кв. м общей площади |

**Продавец:** Минский городской исполнительный комитет, пр-т. Независимости 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 2261672, 327-40-22, сайт: www.mgcn.by.

**Порядок проведения электронных торгов:** электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 (далее – Положение).

**Для участия в электронных торгах необходимо** ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу **http://minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – **30.08.2018 г.**

Дата и время начала проведения электронных торгов**: 5 сентября 2018 года в 11.30** (по времени на сервере ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ»).

**Победитель** электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5 % (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

– внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

– выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона **договор аренды земельного участка сроком на 5 лет**.

**Размер штрафа, уплачиваемого участником электронных торгов и (или) их победителем (претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет:**

по земельному участку для строительства объекта «Многофункциональный общественный комплекс с перехватывающим паркингом в районе ул. Корженевского – ул. Кижеватова» – 154 500,00 руб. (сто пятьдесят четыре тысячи пятьсот белорусских рублей);

по земельному участку для строительства объекта «Торгово-обслуживающий объект по ул. Неманской в г. Минске» – 11 100,00 руб. (одиннадцать тысяч сто белорусских рублей).

**Прием заявлений** на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется **по 30.08.2018** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2, тел. (017) 2261672.

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ» **(http://minskestate.by).**

# Як падрыхтавацца да ультрагукавога даследавання

**Ультрагукавое даследаванне — сучасны і бяспечны метад, які практычна не мае супрацьпаказанняў. Яго выкарыстоўваюць для дыягностыкі паталогій органаў брушной поласці, органаў малога таза, малочных залоз, нырак, шчытападобнай залозы, для дыягностыкі і маніторынгу працякання цяжарнасці, стану плода і плацэнты. Узроставых абмежаванняў для правядзення УГД не існуе. Але некаторыя віды патрабуюць спецыяльнай падрыхтоўкі. Як яе выканаць правільна, расказала ўрач-тэрапеўт вышэйшай катэгорыі 2-й Цэнтральнай раённай паліклінікі Мінска Алена ЛАПСАР.**

## УГД органаў брушной поласці



За тры дні да даследавання неабходна перайсці на бясшлакавую дыету, выключыць з рацыёну прадукты, якія ўзмацняюць газаўтварэнне ў кішэчніку (сырая гародніна, багатая на раслінную клятчатку, неразведзенае малако, чорны хлеб, бабовыя, газіраваныя напоі, а таксама высокакаларыйныя кандытарскія вырабы — піротныя, тарты).

— Мэтазгодна ў гэты час прымаць па 2-4 таблеткі актываванага вугалю, які дапаможа зменшыць праявы метэарызму. З парушэннямі стрававання можна прымаць мезім-фортэ, панзінорм ці фестал — па 1 таблетцы падчас прыёму ежы, але лепш пракансультавацца ў вашага ўрача, — засяроджвае ўвагу Алена Сяргееўна.

За два дні да даследавання зрабіць ачышчальную клізму (але не напярэдадні!). Калі даследаванне раніцай, апошні прыём ежы павінен быць не пазней за 19 гадзін папярэдняга дня. УГД праводзіцца выключна нашча. Калі даследаванне будзе ў другой палове дня, есці да яго не рэкамендуецца не менш за 6, а лепш 10 гадзін.

Не рэкамендуецца курыць перад даследаваннем. Калі вы прымаеце лекавыя сродкі, папярэдзьце пра гэта ўрача УГД. Нельга праводзіць даследаванне пасля гастра- і каланаскапіі.

Пры правядзенні УГД органаў брушной поласці з вызначэннем функцыі жоўцевага пузыра з сабой варта ўзяць два сырыя жаўткі ці паўлітра кефіру 3,2 % ці 100—200 мл вяршкоў не менш за 10 %.

## УГД органаў малога таза

Раніцай пры неабходнасці апаражніць кішэчнік, а перад даследаваннем — мачавы пузыр. Есці і піць у дзень даследавання можна, яно праводзіцца не нашча. Жанчынам варта яго праходзіць у першай фазе менструальнага цыкла — на 5-7 дзень.

## УГД органаў малога таза

(з напоўненым мачавым пузыром) для мужчын і жанчын, а таксама УГД мачавога пузыра

За паўтары гадзіны да даследавання неабходна паступова выпіць 1-1,5 літра любой негазіраванай вадкасці (гарбаты, морсу, вады) і прыбыць на даследаванне з напоўненым мачавым пузыром. Пры немагчымасці трываць дапускаецца крыху апаражніць пузыр для зняцця напружання і паўторна выпіць крыху вадкасці для дасягнення напаўнення да моманту даследавання.

## УГД нырак

Калі ў пацыента маецца лішняя вага і павышанае газаўтварэнне ў кішэчніку, падрыхтоўка праводзіцца як пры УГД брушной поласці. У дзень даследавання есці і піць можна, даследаванне праводзіцца не нашча.

## УГД малочных залоз

Даследаванне малочных залоз лепш праводзіць у планавым парадку — на 5-7 дзень менструальнага цыкла. Але калі з'явіўся нехарактэрны болевы сіндром ці новаўтварэнні — у любы дзень.

## УГД наднырачнікаў і шчытападобнай залозы

Гэтыя даследаванні ніякай падрыхтоўкі не прадугледжваюць.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# ЧАМУ БАЛІЦЬ ГАЛАВА?



Як пазбавіцца ад прыступаў мігрэні

**«Галава баліць, значыць яна ёсць!» — слабае суцяшэнне, калі боль становіцца нясцерпным ці трывожыць шмат гадзін запар. Пра мігрэнь вядома яшчэ са старажытных часоў: у папірусах егіпцян, напісаных больш за тры тысячы гадоў таму, апісаны клінічная карціна прыступаў галаўнога болю і лекавыя сродкі для іх лячэння. Аднак дагэтуль чалавецтву не ўдалося перамагчы гэтую немач. Як змагацца з хваробай, каб яна не рабіла невыносным жыццё чалавеку і яго блізкім, расказала ўрач-неўролаг 11-й гарадской паліклінікі Мінска Зоя КУРС.**

Мігрэнь з'яўляецца хранічнай хваробай, якая характарызуецца прыступамі аднабаковага пульсуючага болю. Кожны прыступ працягваецца ад 4 да 72 гадзін і суправаджаецца павышанай адчувальнасцю да святла (фотафобіяй), гуку (фонафобіяй) і вегетатыўнымі парушэннямі.

— Мігрэнь — надзвычай распаўсюджаная паталогія, на яе пакутуюць 12—15 % людзей, — адзначае Зоя Анатолеўна. — Чвэрць насельніцтва хоць бы раз за сваё жыццё адчувала прыступ мігрэні. Прычым жанчыны пакутуюць у 2-3 разы часцей, чым мужчыны. Тлумачыцца гэта тым, што прычыны хваробы могуць быць звязаны як са стрэсавымі сітуацыямі, так і з гарманальным фонам. У апошнім выпадку боль, як правіла, пачынаецца ў дзяўчынак у падлеткавым узросце і затухае ў клімактэрычным перыядзе, калі колькасць гармонаў зніжаецца. Справакаваць прыступ можа і харчаванне.



Найбольш частыя месцы лакалізацыі болі пры мігрэні

**«Важна адрозніваць галаўны боль напружання ад мігрэні. Апошняя мае прыступападобны характар і баліць, як правіла, палова галавы — левая ці правая».**

Найчасцей мігрэнь бярэ ў палон людзей працаздольнага ўзросту. І ў сярэднім на кожнага пацыента з гэтай хваробай прыпадае 3,2 рабочага дня ў год. Частка пацыентаў працягвае працоўную дзейнасць у момант прыступу болю, але даказана, што актыўнасць у гэты час зніжаецца больш чым на 46 %.

Дыягназ мігрэні ставіцца на аснове характэрнай клінічнай карціны пасля пільнага неўралагічнага абследавання.

— Абследаванне неабходнае і для выключэння іншых захворванняў, для якіх уласцівыя прыступы галаўнога болю, — працягвае Зоя Курс. — Важна таксама адрозніваць галаўны боль напружання ад мігрэні. Апошняя мае прыступападобны характар і баліць, як правіла, палова галавы — левая ці правая.

## ЛЯЧЭННЕ МІГРЭНІ

Яно мае два кірункі. Першы — купіраванне непасрэдна прыступу, які ўжо развіўся. Тут прызначаюцца анальгетыкі, нестэроідныя супрацьзапаленчыя прэпараты, камбінаваныя сродкі. На сёння самая эфектыўная група прэпаратаў — селектыўныя аганісты сератанінавых рэцэптараў (трыптаны), яны выкарыстоўваюцца для лячэння любых формаў мігрэні. У якасці дапаможных медыкаментозных сродкаў прызначаюцца супрацірвотныя, седатыўныя прэпараты, транквілізатары, антыдэпрэсанты.

## ПРАФІЛАКТЫКА

Многія недаацэньваюць ролю прафілактычнага лячэння, якое істотна дапамагае зменшыць ці нават пазбавіцца ад галаўнога болю. Прафілактыка ўключае медыкаментознае лячэнне, якое прызначае ўрач. Тут вельмі важна выявіць правакуючыя фактары, якія можна ліквідаваць. Найчасцей гэта стрэс і launching перамотамленне, недасыпанне і неправільнае харчаванне. Часта для змяншэння частаты і інтэнсіўнасці прыступаў мігрэні дастаткова рэкамендаваць дыету і выключыць некаторыя прадукты. Да ежы, што правакуе галаўныя болі, адносяцца алкаголь, асабліва чырвонае віно, піва, шампанскае, прадукты, у якіх утрымліваецца тырамін — цвёрдыя і вытрыманыя сыры, марынаваны селядзец, курыная печань, бабы, фасоля, таксама прадукты і напоі, у якіх утрымліваецца аспартам (Nutra Sweet) — штучны падсалоджвальнік. Непажаданыя і прадукты, дзе ёсць sodium nitrit, які надае ім чырвоны колер: бекон, вяндліна, салямі, некаторыя малочныя прадукты (смятана, шакаладнае малако), прадукты з monosodium glutamat (вострыя кітайскія соусы), шакалад, шакаладны сіроп, кока-кола.

**«Чвэрць насельніцтва хоць бы раз за сваё жыццё адчувала прыступ мігрэні. Прычым жанчыны пакутуюць у 2-3 разы часцей, чым мужчыны».**

Зніжэнне цукру ў крыві вядзе да цэрэбральнай вазадылатацыі, што можа справакаваць прыступ мігрэні. Таму пацыенты павінны прытрымлівацца збалансаванага трохразовага харчавання, пазбягаць празмернай вугляводнай нагрузкі, а таксама перасыпання.

У 70% жанчын прыступы мігрэні звязаныя з менструальным цыклам. Вядома таксама пачашчэнне прыступаў мігрэні пры выкарыстанні аральных кантрацэптываў. Важна пазбягаць курэння.

Пры трывожных станах і дэпрэсіях паказаныя псіхатэрапія і медыкаментознае лячэнне. Усім хворым, у якіх прыступы мігрэні здараюцца часцей за 2 разы на месяц, прызначаецца дадатковае лячэнне. Выкарыстоўваюцца і немедыкаментозныя метады: іголкарэфлексатэрапія, гіпербарычная аксігенацыя (метад выкарыстання кіслароду пад высокім ціскам), водалячэнне, аўтагенная трэніроўка, лячэбная фізкультура.

## НАРОДНЫЯ СРОДКІ

Яны таксама часта дапамагаюць аблегчыць пакуты. Народная медыцына рэкамендуе пры мігрэні прыкладаць да балючай часткі галавы свежае лісце бэзу ці белакачаннай капусты, таксама лустачкі сырой бульбы. Можна рукі з локцямі апусціць у гарачую ваду і трымаць іх там да той пары, пакуль боль не пройдзе. Час ад часу падліваць гарачую ваду. Стары лячэбнік дае такі рэцэпт: «Зрэзаць са свежага лімона вострым нажом з самай верхняй коркі кружок, ачысціць яго ад белага рэчыва і ўнутраным вільготным бокам прыкласці да скроні, а калі трэба, то да абедзвюх. Кружкі прыліпаюць хутка і трывала і за кароткі час нацягваюць на віску чырвоную пляму, але галаўны боль праз пэўны час пройдзе. Лімонны кружок здымаць не трэба, пакуль цалкам не пройдзе боль».

Не існуе метадаў вылечыцца ад мігрэні бясследна. Але ў большасці людзей з гэтай хваробай з узростам прыступы становяцца больш рэдкімі.

Калі ў вас з'явіўся галаўны боль, не займайцеся самастойна пастаноўкай дыягназу і самалячэннем, звярніцеся для гэтага да ўрача.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЧАМУ ПЕРАЦ «БЯЗДЗЕТНЫ»

**Калі перац выдатна расце, але пры гэтым нават не цвіце, то прычына, хутчэй за ўсё, у вялікай колькасці гною, унесенага пад перакопку, або каравяку, якім часта падкормлівалі расліны. Але не толькі...**



Перцу ўнясенне вялікай колькасці азотных угнаенняў шкоднае. Варта падкармліваць комплексным угнаеннем, у якім мала азоту, затое шмат фосфару і калію.

Можна наогул перайсці на чыстыя фосфарна-калійныя ўгнаенні. Яны могуць спыніць жыраванне кустоў і прымусіць расліны цвісці. Кветак пасля такіх падкормак бывае больш, чым лісця...

Другая прычына «бяздзетнага» перцу ў тым, што яму не хапае святла. Калі яго нешта зацяняе, то цвіцення можна наогул не дачакацца. Тут ужо нічога не зрабіць, можна толькі прарэдзіць кроны дрэў, якія зацяняюць, каб прыйсці да кампрамісу.

Часта бывае, што перац цвіце, а пладоў усё роўна няма. Кветкі і завязі проста абсыпаюцца. Гэтаму ёсць шмат тлумачэнняў. Адна з іх — кіслая глеба. На кіслай глебе перцы наогул растуць неахвотна. Таму іх трэба ўзбадзёрыць, унёсшы ў глебу кальцыевую салетру або паліўшы расліны вапнавым малачком.

Прычынай адсутнасці пладанашэння можа быць і адсутнасць апылення. Звычайна з гэтым праблем не бывае, бо побач садзяць некалькі сартоў. Але калі вільготнасць стаіць высокая, то кветкі могуць і не апыліцца. У гэтым выпадку трэба апрацаваць расліны адпаведным сродкам для завязвання пладоў. Хоць і яны не заўсёды могуць дапамагчы. Многае залежыць ад надвор'я.

Абсыпацца завязі могуць ад недахопу вады. Перасыханне глебы для іх згубнае. Каб гэтага не адбылося, градкі паліваюць часта, але невялікімі порцыямі. А яшчэ лепш замульчыраваць іх саломай.

Часам перцу проста не хапае цяпла. У гэтым выпадку яго трэба апырскаць стымулятарамі росту, напрыклад Цырконам.

# ЧЫМ І КОЛЬКІ РАЗОЎ КАРМІЦЬ САД

**У адрозненне ад гародніны, пладовыя дрэвы маюць патрэбу ў трох падкормках за сезон.**

Першая — у момант развароту лісця: аміячная салетра (20—30 г на м²), сернакіслы калій (10—20 г на м²).

Другая — у перыяд абсыпання завязяў: комплексныя ўгнаенні ў выглядзе азафоскі, нітрафоскі або калімагнезіі (не больш за 35 г на сотку) з дадаткам мачавіны (1—3 ст. лыжкі на м²).

Трэцяя — у канцы жніўня, у перыяд паспявання пладоў у восеньскіх сартоў яблынь. Праводзяць растворам падвойнага суперфасфату (2 ст. лыжкі) і сернакіслага калію (1 ст. лыжка) на 10 л вады. Выліваецца па 10 л гэтага раствору на кожны квадратны метр. Пад рыхленне можна ўнесці ў глебу просты суперфасфат. Ён паступова будзе пранікаць у глебу да каранёў і працаваць нават у наступным годзе.

Гэта стандартная схема падкормак пладовых дрэў. Але апошнім часам усё часцей яе замяняюць еўрапейскімі падкормкамі. Калі расліны паліваюць угнаеннямі раз у два тыдні, але дазіроўкі выкарыстоўваюць вельмі нізкія — не больш за 1 ст. лыжку на 100 л вады. Сад пры такім падыходзе пладаносіць асабліва шчодра.

Таксама можна два-тры разы на год раскладваць па перыферыі кроны дрэў кампост. Тады дрэвам наогул не спатрэбіцца ніякія падкормкі, акрамя мікраэлементаў, што можна ўнесці ў растворы пестыцыдаў пры апырскванні.



# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.23 | 21.08 | 15.45 |
| Віцебск — | 5.07 | 21.03 | 15.56 |
| Магілёў — | 5.13 | 20.58 | 15.45 |
| Гомель — | 5.16 | 20.48 | 15.32 |
| Гродна — | 5.39 | 21.22 | 15.43 |
| Брэст — | 5.46 | 21.16 | 15.30 |

## Месяц

*Поўня 27 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

***Пр.** Макрыны, Міліцы, Рамана, Серафіма, Сцяпана.*
***К.** Надзеі, Альфонса, Пятра, Юстына.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**1 ЖНІЎНЯ**




**1520** год — нарадзіўся Жыгімонт II Аўгуст, вялікі князь ВКЛ і кароль польскі. Сын Жыгімонта I Старога і Боны Сфорцы. У кастрычніку 1529 года абраны вялікім князем, а ў снежні 1529-га — польскім каралём (каранаваны ў 1530-м). У 1547 годзе ажаніўся з Барбарай Радзівіл. Лівонская вайна 1558—1583 гадоў падштурхнула Жыгімонта II да заключэння Люблінскай уніі 1569 года і стварэння Рэчы Паспалітай. Прывілеем 1563 года канчаткова ўраўняў палітычныя правы праваслаўнай шляхты ВКЛ з каталіцкай. Зацвердзіў Статут ВКЛ 1566 года. У апошнія гады кіравання пад ціскам каталіцкай царквы пагадзіўся дапусціць езуітаў у Польшчу і ВКЛ, што стала пачаткам Контррэфармацыі. Яго кіраванне было перыядам росквіту культуры Адраджэння ў ВКЛ. Памёр у 1572 годзе.



**1908** год — нарадзіўся (г. Іжэўск, Расія) Аляксандр Мікалаевіч Сабураў, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Украіны і Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр. Восенню 1941 года арганізаваў партызанскі атрад, які дзейнічаў на тэрыторыі Сумскай і Бранскай абласцей. У сакавіку 1942 года ўзначаліў партызанскае злучэнне, якое вырасла на базе гэтага атрада. Знаходзячыся на тэрыторыі Беларускага Палесся, злучэнне Сабурава наладзіла сувязі з партызанскімі злучэннямі Мінскай і Пінскай абласцей, Слуцкай зоны, 210-й Капаткевіцкай брыгадай і інш. З красавіка 1944 да 1957 года быў на адказнай рабоце ў МУС СССР. Памёр у 1974 годзе.

**1920** год — створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Беларускай ССР на чале з А. Р. Чарвяковым. Падпарадкоўваўся Рэўваенсавету Заходняга фронту. Асноўныя задачы: арганізацыя савецкай улады на месцах, дапамога Чырвонай Арміі, падрыхтоўка склікання з'езду Саветаў і выбары пастаянных органаў улады. Друкаванымі органамі — газеты «Звезда», «Известия военно-революционного комитета ССРБ» і паветовыя газеты.

**1953** год — нарадзіўся (вёска Быкаўка Шчучынскага раёна) Сяргей Аляксандравіч Маскевіч, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па спектраскапіі біяарганічных малекул.




**1798** год — падчас егіпецкай экспедыцыі Напалеона Банапарта ў Абукірскім заліве адбылася марская бітва, у якой французскі флот пацярпеў поўнае паражэнне ад англійскай эскадры адмірала Нэльсана.

**1923** год — нарадзілася Валянціна Міхайлаўна Лявонцьева, дыктар Цэнтральнага тэлебачання СССР, народная артыстка СССР. Доўгія гады вяла праграмы «Добрай ночы, малыя!», «У гасцях у казкі», «Блакітны агеньчык» і інш. Памерла ў 2007 годзе.

**1975** — у Хельсінкі прадстаўнікі 33-х еўрапейскіх краін, а таксама ЗША і Канады падпісалі Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (НБСЕ), які заклаў новыя прынцыпы міжнароднага супрацоўніцтва. Арганізацыя, якая ўзнікла тады, атрымала назву Нарада па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (НБСЕ; з 1 студзеня 1995 года — Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, АБСЕ).

## УСМІХНЕМСЯ

**Дзяцінства — гэта калі дрэвы былі вялікія, а жывот маленькі.**

Адна акула другой:
— А я ўчора рускага дайвера з'ела!
— Хлусіш!
— Не хлушу!
— Ану дыхні!

**Супрацоўнік клінінгавай кампаніі адрозніваецца ад прыбіральшчыцы тым, што ў яго вядро на колах.**

Рэктар на выпускным:
— Пасля заканчэння навучання едзьце ў Амерыку. Няхай у іх там эканоміка абваліцца.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2854.

Нумар падпісаны ў 19.30 31 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12